

СЕЗОН НАРЫХТОВАК МС

ФОРУМ РЭГІЁНАЎ — ПЛАНЫ НА ТЫДЗЕНЬ МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

5 КАСТРЫЧНІКА 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 192 (28808)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый КРУТОЙ, міністр эканомікі:**

*«У рамках падрыхтоўкі новай рэдакцыі Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця да 2035 года мы павінны разумець, што ў сучасным свеце эканамічная абстаноўка мяняецца настолькі хутка, што пры распрацоўцы прагнозных дакументаў на каротка- і сярэднетэрміновую перспектыву цяжка ўлічваць задачы на доўгатэрміновы перыяд. Пры фарміраванні новай канцэпцыі НСУР перш за ўсё неабходна прыняць да ўвагі два асноўныя трэнды: інфарматызацыю і глабалізацыю. Мы павінны выразна ўяўляць месца Беларусі ў гэтых трэндах. Акрамя таго, трэба ўлічваць планаемы ў іншых прагнозных дакументах рост ВУП, які будзе забяспечвацца за кошт не столькі буйных прамысловых айчынных вытворчасцяў, колькі за кошт росту рынку сферы паслуг, малога і сярэдняга бізнесу».*

# ГАСПАДЫНЯ ХЛЕБНАГА ДОМА



**Ірына НІКІШОВА — гаспадыня музея хлеба, які знаходзіцца ў вёсцы Бацвінава Чачэрскага раёна. У гэтым шматзначным слове — гаспадыня — крыецца і тое, што Ірына Міхайлаўна яшчэ і выдатны майстар па выпечцы хлебабулачных вырабаў. Гэтаму рамяству яе, работніка культуры, навучыла маці. Амаль кожны дзень яна замешвае муку, робіць цеста, накладвае яго ў формы, ставіць у жар. Гэтую магічную працэдуру бачаць і экскурсіі, і выпадковыя турысты, і школьнікі, і, вядома, аднавяскоўцы.**

**Музей дзейнічае ўжо дзесяць гадоў. Ён узнік у рамках праекта мясцовай ініцыятывы, падтрыманай Праграмай развіцця ААН. Часта пытаюць у гаспадыні, чаму ў яе атрымліваюцца такія смачныя і прыгожыя булкі-пірагі, на што Ірына прыгадвае гісторыю: «Калі адкрывалі наш музей, я выпекла хлябок, які быў падобны на сонейка. З таго часу, як прыкмета, пірагі атрымліваюцца на славу».**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Беларусь стане арганізатарам Сусветнай шахматнай алімпіяды ў 2022 годзе.**
- Актывісты БРСМ Мінска правялі «Дыялог пакаленняў» з ветэранамі камсамола.



- **Фільм «Хрусталь» рэжысёра Дар'і Жук у Беларусі ўбачылі больш за 18 тыс. гледачоў.**
- Сельскагаспадарчыя кірмашы пройдуць 6—7 кастрычніка каля Палаца спорту і «Чыжоўка-Арэны» ў Мінску.

ISSN 1990 - 763X

Падзея

## Свой электрасамакат, суперкандэнсатар і яшчэ 158 навуковых распрацовак

**Усё гэта прадставяць наведвальнікам XXIII Беларускага энергетычнага і экалагічнага форуму, які пройдзе 8—12 кастрычніка ў Мінску**

**Сёлета ў ім прымуць удзел больш за 300 арганізацый з 16 краін свету, паведаміла намеснік міністра энергетыкі Вольга Прудніка на прэс-канферэнцыі ў БелТА.**

Штогод гэты высокі сход становіцца ўнікальным месцам сустрэч энергетыкаў і эколагаў нашай краіны і замежжа, спрыяючы тым самым пашырэнню супрацоўніцтва, абмену перадавымі распрацоўкамі і праектамі. Мэта форуму — прадставіць сучаснае абсталяванне і тэхналогіі для вытворчасці і размеркавання электрычнай і цеплавой энергіі, аўтаматызаваныя сістэмы, энерга- і рэсурсазберагальныя тэхналогіі, аказаць садзейнічанне інавацыйнаму развіццю паліўна-энергетычнага комплексу.

На 9 кастрычніка запланаваны кірмаш інавацыйных распрацовак у сферы энергетыкі. «Гэты кірмаш — пляцоўка для нашых распрацоўшчыкаў і патэнцыйных інвестараў, каб спланаваць магчымыя праекты і будучыя высокапрыбытковыя прадпрыемствы, таму што менавіта навукова-тэхналагічныя распрацоўкі дазваляюць стварыць прадукцыю з максімальнай дабаўленай вартасцю», — паведаміў **намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Сяргей ШЧАРБАКОЎ.**

«Будзе прадстаўлены ўзор электрасамаката, які, у прынцыпе, гатовы да тыражавання», — адзначыў Сяргей Шчарбакоў. Усяго гасцям форуму пакажуць 158 навукова-тэхнічных распрацовак (Нацыянальнай акадэміі навук, Міністэрства адукацыі, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, прыватных кампаній).

СТАР. 2

Размова па сутнасці

## ДЗЕЦІ РАГВАЛОДАВЫХ УНУКАЎ

### Адкуль паходзіць наша дзяржаўнасць?

**На пытанне, якое пэўны час для некаторых заставалася спрэчным, нарэшце дадзены канчатковы адказ. Беларускім археолагам удалося даказаць, што беларуская дзяржаўнасць была запачаткаваная яшчэ ў IX—XIII стагоддзях, яе вытокам стала Полацкае княства. Гісторыкі, грамадскія дзеячы сабраліся, каб абмеркаваць гэту тэму за круглым сталом, арганізаваным РГА «Белая Русь» у прэс-цэнтры БелТА. Надзвычай цікава было пачуць ад вядомых даследчыкаў абгрунтаваныя доказы з гэтай нагоды.**

Мадэратарам сустрэчы выступіў **старшыня «Белай Русі» Генадзь ДАВЫДЗЬКА,** ён адзначыў:

— Гісторыя Беларусі ў савецкай агульнаадукацыйнай школе не вылучалася як асобны прадмет, а разглядалася як састаўная частка вялікай дзяржавы. З гэтай прычыны ў свядомасці многіх беларускіх грамадзян гісторыя дзяржаўнасці бярэ пачатак пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.



Фота БелТА.

СТАР. 4

■ Падрабязнасці

# «ЗА ТРЫ ГАДЫ РЭАЛЬНА ПАДНЯЦЬ ПРАДПРЫЕМСТВА НА ВЕЛЬМІ ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ»

## Што дае Указ № 399 «Аб фінансавым аздараўленні сельскагаспадарчых арганізацый»?

**Дакумент днямі падпісаў кіраўнік дзяржавы, пра што паведамлялі ў прэс-службе беларускага лідара. У гэтым матэрыяле мы растлумачым, якія галоўныя інструменты і механізмы аздараўлення атрымалі неплацежаздольныя арганізацыі. Акрамя таго, мы сабралі меркаванні людзей, якім трэба будзе непасрэдна працаваць з новым указам.**

Такім чынам, галоўныя пастановы дакумента наступныя. Па-першае, у дачыненні да неплацежаздольных сельгасарганізацый не будзе праводзіцца працэдура банкруцтва, калі працэс ужо запушчаны, то ён спыняецца.

Па-другое, фінансавае аздараўленне неплацежаздольных сельгасарганізацый будзе ажыццяўляцца ў дасудовым парадку, у сувязі з чым старшыні райвыканкамаў атрымліваюць шырокія паўнамоцтвы.

Акрамя таго, найважнейшы момант заключаецца ў тым, што калі сельгасарганізацыя перадаецца ў арэнду або давернае кіраванне, то работнікі захоўваюць працоўныя адносіны на аснове ўмоў дагавораў. Гэта не датычыцца толькі кіраўніка, яго намеснікаў і галоўнага бухгалтара.

На думку **старшыні Бабруйскага раённага выканаўчага камітэта Паўла НАЙДЗЁНА,** гэта робіцца для падтрымкі работнікаў. «Я думаю, гэта своечасовы ўказ. Зараз той час, калі ўсе названыя прэферэнцыі для вяскоўцаў, работнікаў гэтых прадпрыемстваў — гэта гарантыя таго, што яны не застануцца без працы», — сказаў ён.

Таксама ва ўказе замацавана павелічэнне статутнага фонду гаспадарчага таварыства ў межах сумы запазычанасці, якая ўтварылася, з перадачай акцый (або доляй у статутным фондзе) ва ўласнасць крэдытора. **Антыкрызісны кіраўнік ААТ «Дварэцкі» Іван ГРЫЦКЕВІЧ** растлумачыў сэнс такога механізма:

«Я так разумею, калі, напрыклад, выпусціць дадатковыя акцыі на суму запазычанасці, то аўтаматычна гаспадарка не будзе банкрутам, таму што каэфіцыент нармалізуецца і запазычанасці як такой ужо не будзе, паколькі за яе выпусцілі акцыі, якія атрымаў крэдытор. Па сутнасці, доўгу няма, а крэдытор становіцца акцыянерам», — растлумачыў спецыяліст.

Ён дадаў, што гэта асабліва актуальна для тых гаспадарак, якія знаходзяцца ў банкруцтве, аднак маюць абаротныя сродкі. У такім выпадку крэдытор будзе ўпэўнены ў тым, што атрымае свае дывідэнды.

Яшчэ ў дакуменце існуе даволі незвычайная заахвочвальная мера: калі кіраўнік паспяхова выконвае бізнес-план, Прэзідэнт можа сваім рашэннем бязвыплатна перадаць яму акцыі арганізацыі ў колькасці не больш за 25 % плюс адна акцыя (доля ў памеры не больш за 25,01 % статутнага фонду).

З гэтай нагоды Іван Грыцкевіч падкрэсліў: тут гаворка ідзе не пра антыкрызіснага кіраўніка, а менавіта пра кіраўніка прадпрыемства. Тут жа ўзнікае пытанне: цяпер у некаторых прадпрыемствах, якія знаходзяцца ў працэдуры банкруцтва, проста няма дырэктара, а антыкрызісны кіраўнік не можа прэтэндаваць на акцыі. Хто тады ў выпадку поспеху атрымае ўзнагароду? Спецыяліст сказаў, што гэты аспект, напэўна, стане зразумелы пасля таго, як указ пачне рэальна працаваць.

Яшчэ адну асаблівасць указа адзначыў **першы намеснік старшыні — начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Ваўкавыскага раённага выканаўчага камітэта Дзмітрый ЗАХАРЧУК:**

«Даецца магчымасць кіраўніку прадпрыемства пачаць з чыстага ліста. Указам прадугледжана адтэрміноўка ўсіх плацяжоў на тры гады, а таксама растэрміноўка на пяць гадоў усіх наяўных даўгоў, якія былі да таго. Увогуле, усё даволі прывабна».

Дарэчы, пры гэтым працэнтная стаўка па крэдытах можа быць зніжана да 1,5 % гадавых.

На яго думку, дакумент — добры, але тут самае галоўнае пытанне заключаецца ў падборы кадраў. «Калі трапляе прадпрыемства пад дзеянне гэтага ўказа, то павінен прыйсці ўпэўнены і граматны чалавек, які разумее спецыфіку цяперашняй сітуацыі. Бо за тры гады рэальна падняць прадпрыемства на вельмі высокі ўзровень», — падзяліўся ўласным меркаваннем спецыяліст.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

# Свой электрасамакат, суперкандэнсатар і яшчэ 158 навуковых распрацовак

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сярод іх — фільтры для ачысткі сціснутых газаў ад цвёрдых часціц і аэразоляў на прадпрыемствах хімічнай і нафтагазавай прамысловасці, доследны ўзор суперкандэнсатараў на аснове графензмяшчальнага матэрыялу (гэтую разработку будуць прымяняць у электратранспарце), экспертная сістэма рэабілітацыі геалагічнага асяроддзя, забруджанага нафтапрадуктамі.

## І зноў пра АЭС...

Адказваючы на пытанні журналістаў, Вольга Пруднікава закранула тэму будучых паставак электраэнергіі на знешнія рынкі. У цяперашні час фарміруецца агульны электраэнергетычны рынак у рамках ЕАЭС, дагавор аб стварэнні рынку павінен быць падпісаны да 1 ліпеня 2019 года. «Пасля ўводу атамнай станцыі мы павялічым магчымасці свайго экспартнага патэнцыялу — як у цэлым энергетычная галіна, так і суб'екты гаспадарання, якія па пэўных крытэрыях будуць мець магчымасць выхаду на агульны электраэнергетычны рынак саюза», — адзначыла яна.

Энергетык пацвердзіла, што першы энергаблок будзе ўведзены да канца 2019 года. «У цяперашні час будаўнічыя работы ідуць інтэнсіўным тэмпамі, задзейнічаны беларускія і расійскія арганізацыі», — удакладніла яна. Ідзе падрыхтоўка беларускай энергасістэмы да інтэграцыі ў яе БелАЭС.

Адказваючы на пытанне аб дыялогу з літоўскім бокам па будаўніцтве АЭС у Астраўцы, **першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ія МАЛКІНА** адзначыла: «Нягледзячы на праблемныя пытанні, ёсць пэўнае разуменне на ўзроўні экспертнай супольнасці тых працэсаў, якія адбываюцца. Мы спадзяёмся, што будучая ў лютым 2019 года чарговая сесія Нарады бакоў Канвенцыі Эспа паставіць усё-такі кропку ў гэтым пытанні».



Фота БелТА.

На яе погляд, наша краіна сёння сканцэнтравана ў першую чаргу на выкананні рэкамендацый, якія былі дадзены абодвум бакам у рамках сесіі Нарады бакоў Канвенцыі Эспа ў 2014 годзе. Яны разглядаюцца ў якасці асноў для далейшага двухбаковага супрацоўніцтва. «У цэлым хацелася б адзначыць, што за 2017 год і першую палову 2018-га ў значнай ступені мы прасунуліся па тэматыцы інфармавання нашых еўрапейскіх калег, суседзяў аб тым працэсе, які адбываецца на пляцоўцы будаўніцтва БелАЭС», — адзначыла першы намеснік міністра.

Як вядома, наша краіна і Літва адмовіліся ад фармату двухбаковых перагавораў. Мы пераканаліся, што прыцягненне экспертаў з боку міжнародных кампетэнтных арганізацый з'яўляецца найбольш прагрэсіўным і прадукцыйным механізмам узаемадзеяння для пошуку прагрэсу.

Эксперты Беларусі і Літвы працягваюць сумесную працу па падрыхтоўцы праекта двухбаковага міжурадавага пагаднення па ажыццяўленні Канвенцыі Эспа. «Гэта двухбаковы міждзяржаўны дагавор, паім у нас ёсць пэўны прагрэс. Мы плануем да канца лістапада гэтага года правесці яшчэ адну сустрэчу, якая, як нам здаецца, дазволіць падысці да стадыі ўнутрыдзяржаўных працэдур узгаднення», — удакладніла Ія Малкіна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Вам адкажуць кампетэнтныя асобы

**Традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі адбудуцца 6 кастрычніка ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме. На пытанні жыхароў краіны з 9 да 12 гадзін адкажуць:**

намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Андрэй Анатолевіч КЛЕЦ. Тэл. 8 016 221-31-21;

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Барыс Сяргеевіч ЯФРЭМАЎ. Тэл. 8 021 222-22-22;

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233-12-37;

намеснік старшыні ГРОДЗЕНСКАГА аблвыканкама Алена Аляксандраўна БУБЕНЧЫК. Тэл. 8 015 273-56-44;

намеснік старшыні МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Віктар Уладзіміравіч НЕКРАШЭВІЧ. Тэл. 8 022 250-18-69;

старшыня МІНСКАГА аблсавета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500-41-60;

старшыня МІНСКАГА гарсавета дэпутатаў Васіль Васілевіч ПАНАСЮК. Тэл. 8 017 222-44-44.

■ Камунальныя стасункі

# КАМУ — ГОРАЧА, КАМУ — НЕ ВЕЛЬМІ

### Гродзеншчына ўцяплілася амаль поўнасцю, Брэстчына пачала, а Гомельшчына пакуль не

**Кансервуюцца фантаны і атракцыёны ў парках, стрыгуцца кусты і дрэвы, ацяпленне ўключана ва ўсіх сацыяльных аб'ектах, установах аховы здароўя і адукацыі рэгіёнаў Беларусі. Так краіна рыхтуецца да зімы. Толькі вось абаграваюць жыллё па-рознаму. Па звестках на ўчарашні дзень амаль поўнасцю дамы ацяплілі жыллёва-камунальныя службы Слуцка, Клецка, Смалявіч, Стоўбцаў і гаспадарка Мінскага раёна. Цяпло ў сталіцы прыйшло ўжо больш як у 70 % кватэр, у Магілёўскай вобласці — у 38 % жылля, у Мінскай — 32 %, Гродзенскай — 70 %, Віцебскай — 22 %, Брэсцкай — 4 %. А вось Гомельская вобласць дагэтуль не прыняла рашэнне аб пачатку ацяпляльнага сезона.**

## Пашпарты гатоўнасці, дровы і шчэпкі

У цэлым жыллёва-камунальныя аб'екты краіны гатовыя да асенне-зімовага ацяпляльнага сезона, расказалі спецыялісты. Падрыхтоўку камунальнікаў да яго па пэўных параметрах кантралявалі штодзённа і штомесячна. У выніку маніторынгу працы міністэрствам і іншымі ўпаўнаважанымі арганізацыямі выяўляліся негатыўныя факты падрыхтоўкі, аднак цяпер можна канстатаваць, што сёння работы па большасці паказчыкаў выкананы поўнасцю, заявіў **Генадзь АКСЦІЛОВІЧ, прэс-сакратар Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

— Прынамсі, капітальны рамонт катлоў, прафілактычны рамонт абсталявання кацельных і цеплавых сетак, прафілактычны рамонт сістэм ацяплення, прафілактычны агляд цеплапунктаў выкананы на 100 %.

Па некаторых паказчыках камунальнікі перавысілі норму. Напрыклад, на 110 % адрамантавалі стыкі сценавых панэляў і на 102 % — дахі. Паліва да зімы таксама ёсць. Па словах прэс-сакратара міністэрства, поўнасцю назапашаны топачны мазут, падрыхтавана 1447 тысяч $м^3$ дроў і 516 тысяч $м^3$ шчэпак.

258 спажыўцоў цеплаэнергіі, якія абслугоўваюцца ЖКГ, атрымалі пашпарты гатоўнасці. 3501 пашпарт атрымалі і цеплакрыніцы, якія абслугоўваюцца камунальнікамі.

## Абарона дрэў і пляцоўкі для снегу

Рыхтуюць да зімы не толькі аб'екты, але і расліны. Мяркуецца ўпарадкаваць каля 7000 гектараў тэрыторыі. Лістоту на вуліцах, бульварах і ў скверах прыбяруць поўнасцю. А ў лесапаркавых зонах падмятаецца адно прастора каля ўвахода, у месцах правядзення масавых мерапрыемстваў і пяціметровыя палосы ўздоўж сцежак. Астатняя лістота застаецца для захавання біяцэнозу.

Як добра пахаладае, мнагалетнія расліны прыкрыюць хваёвымі лапамі. А ў лістападзе ад негатыўнага ўплыву будуць абараняць дрэвы, што растуць уздоўж дарог, расказала **Анжаліка ПУЗАНКОВА, кіраўнік службы па добраўпарадкаванні і ўтрыманні аб'ектаў зялёнай гаспадаркі «Мінскзеленбуда».** Ствалы закрыюць спанбондам, а лункі — ахоўнай плёнкай. Дзе неабходна — паставяць шчыты, каб салявыя рэагенты не траплялі на расліны.

Як расказаў **Алег ЛУКАШЭНКА, намеснік генеральнага дырэктара па ўтрыманні аб'ектаў добраўпарадкавання прадпрыемства «Гаррамаўтадар Мінгарвыканкама»,** прадпрыемствам на зіму папярэдне неабходна 54,8 тысячы тон супрацьгалалёдных матэрыялаў.

У Гаррамаўтадары падрыхтавалі для гэтага пясочна-салявыя сумесі на аснове галіту і галіту маркі А. Таксама вызначылі дзесяць асноўных і рэзервовых пляцовак для часовага складавання снегу зімой. Пазбаўляцца ад яго будуць і на снегаплавільным пункце.

— 784 адзінкі спецыялізаванай тэхнікі для працы ўзімку будуць гатовыя да работы ўжо 10 кастрычніка, — запэўніў ён. — Для абароны насельніцтва і аператыўнага рэагавання на надзвычайныя сітуацыі, звязаныя з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я, дзейнічае спецыяльны план «Пурга».

**Ірына СІДАРОК.**

■ Абітурыент-2019

# «РЭПЕТЫЦЫЯ» ЭКЗАМЕНУ: ПЛАТНАЯ І БЯСПЛАТНАЯ

## У кастрычніку ў краіне стартуе першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання

**Пералік устаноў, дзе яно будзе праводзіцца па матэрыялах арганізатараў ЦТ, можна знайсці на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў (www.rikc.by). У многія навучальныя ўстановы запісацца на рэпетыцыйнае тэсціраванне цяпер можна не выходзячы з дома: на іх сайтах адкрыта анлайн-рэгістрацыя. Кошт удзелу ў рэпетыцыйным тэсціраванні складае сем рублёў за адзін прадмет.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Апрацоўка бланкаў адказаў удзельнікаў рэпетыцыйнага тэсціравання і разлік балаў будуць ажыццяўляцца па тэхналогіі ЦТ. Інфармацыю пра свае вынікі абітурыенты змогуць атрымаць на сайце РІКВ па асабістым кодзе ўдзельніка.

На рэпетыцыйнае тэсціраванне могуць трапіць не толькі абітурыенты, але і дзесяцікласнікі, і бацькі школьнікаў, і настаўнікі, і рэпетытары. Яны прыйдуць ва ўніверсітэцкую аўдыторыю, каб на ўласным вопыце пераканацца, ці так проста згуляць ва «ўгадайку» і метадам выпадковага выбару адказаў набраць прыстойную суму балаў. Бо адна справа — разважаць у тэорыі, і зусім іншая — прайсці ўвесь тэст ад «А» да «Я» за строга лімітаваны час.

Удзельнікам рэпетыцыйнага тэсціравання трэба мець на ўвазе, што працэдура яго правядзення нічым не адрозніваецца ад цэнтралізаванага. Задача арганізатараў у аўдыторыях — прытрымліваца ўсіх правілаў правядзення ЦТ, каб адразу настроіць абітурыентаў на сур'ёзны лад і змадэляваць рэальную псіхалагічную абстаноўку правядзення экзамену: прысутнасць мабільнікаў, дапаможнікаў і шпаргалак у экзаменацыйнай аўдыторыі катэгарычна не допускаецца. Арганізатарам дазваляецца кансультаваць удзельнікаў рэпетыцыі толькі па тэхналогіі работы над тэстам і па парадку запаўнення бланка, але ніякіх кансультацый па змесце тэстаў.

Бланачнае рэпетыцыйнае тэсціраванне таксама можна прайсці і непасрэдна ў Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў: тут яно праводзіцца кожны дзень, трэба толькі загадзя зарэгістравацца на яго на сайце інстытута анлайн.

Да пачатку ўступнай кампаніі абітурыенты змогуць праверыць свае веды некалькі разоў. Першы этап рэпетыцыйнага тэсціравання будзе доўжыцца да канца гэтага года. Другі этап пройдзе ў студзені — лютым. Трэці — у сакавіку — красавіку. Кожны раз варыянты, вынесеныя на «рэпетыцыю», будуць змяняцца.

Яшчэ адна магчымасць адпрацаваць тэхналогію экзамену — здаць **дыстанцыйнае тэсціраванне на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў.** Гэта можна зрабіць не выходзячы з дому. Дыстанцыйнае тэсціраванне праводзіцца бясплатна і на яго цягам года выносіцца толькі адзін варыянт тэстаў. Затое бясплатна прайсці дыстанцыйнае тэсціраванне дазваляецца па ўсіх 15 дысцыплінах ЦТ. І трэніравацца на ім можна будзе столькі разоў, колькі абітурыенту патрэбна.

Для набліжэння да рэальных умоў здачы ЦТ на сайце РІКВ падчас выканання тэста можна кіравацца часам, які адводзіцца на пэўны прадмет. Тыя, хто захоча проста адпрацаваць тэхналогію экзамену, змогуць не абмяжоўваць сябе часавымі рамкамі. Акрамя гэтага, электронны бланк адказу можна будзе раздрукаваць, запоўніць, а пасля занесці ўсе пазіцыі з папяровага носьбіту ў электронную версію.

Вынікі тэстаў абітурыенты атрымаюць адразу пасля іх выканання, не пакідаючы сайта РІКВ. У дадатак яны атрымаюць матэрыялы тэматычнага кансультавання, якія ўключаюць само заданне, яго рашэнне і (або) каментарый да яго, правільны адказ і спасылку на падручнік ці вучэбны дапаможнік з указаннем параграфа, у якім выкладзены гэты вучэбны матэрыял. Для набыцця навыкаў запаўнення бланка і недапушчэння тэхнічных памылак пры афармленні адказаў на ЦТ у раздзеле «Дыстанцыйнае рэпетыцыйнае тэсціраванне» прыведзены ўзоры бланка адказаў і відэаролік з падрабязнай інструкцыяй па яго запаўненні.

Пакуль што ў раздзеле «Дыстанцыйнае тэсціраванне» прадстаўлены варыянт, які здавалі абітурыенты бягучага года. Дарэчы, у Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў нам паведамілі, што з моманту запуску на сайце бясплатнага дыстанцыйнага тэсціравання ў ім паўдзельнічалі ўжо больш як 95 тысяч чалавек.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Time назваў верагодных лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі міру — 2018

Амерыканскі часопіс Time склаў спіс верагодных кандыдатаў на атрыманне Нобелеўскай прэміі міру.



Галоўныя прэтэндэнтамі ў спісе Time значацца ўдзельнікі дыялогу вакол лёсу Карэі — лідар КНДР Кім Чэн Ын, прэзідэнт Паўднёвай Карэі Мун Чжэ Ін і прэзідэнт ЗША Дональд Трамп. Лідары Поўначы і Поўдня прыклалі намаганні да таго, каб спыніць ядзерную гонку на паўвостраве і ядзерныя выпрабаванні, якія праводзіліся КНДР, адзначае Time. Гэта робіць іх відавочнымі фаварытамі ў спісе кандыдатаў на Нобелеўскую прэмію. Услед за кіраўнікамі Паўночнай і Паўднёвай Карэі ідзе яшчэ адзін удзельнік міжкарэйскага дыялогу — прэзідэнт ЗША. Увесну Дональд Трамп дамогся першай у гісторыі сустрэчы лідараў Злучаных Штатаў і КНДР, якая прайшла ў Сінгапуры. Найбуйнейшая брытанская букмекерская кантора Ladbrokes ацэньвае шанцы Трампа на перамогу як 5 да 2, адзначае Time.

### Мэр Нью-Ёрка паабяцаў спагнаць з Трампа ўсе недаплачаныя падаткі

Біл дэ Блазіо, які ўзначальвае гарадскую адміністрацыю Нью-Ёрка, заявіў, што прэзідэнт ЗША абвёў вакол пальца падатковыя органы краіны, абышоў рэгулятыўныя нормы і пазбег расследавання і суда, якіх заслугоўваў мноства разоў.

Улады Нью-Ёрка маюць намер спагнаць усе грошы, якія прэзідэнт ЗША Дональд Трамп мог недаплаціць, ухіляючыся ад падаткаў. З такой заявай выступіў учора мэр мегаполіса Біл дэ Блазіо.

«Для мяне зусім ясныя рэальныя наступствы таго, што было выяўлена, няхай гэта будзе магчымае парушэнне закона ці нешта яшчэ. У выпадку заканчэння тэрміну даўнасці ўсё роўна застаецца магчымасць суровых пакаранняў з боку [улад] штата і горада», — папярэдзіў Біл дэ Блазіо, які з'яўляецца адным з найбольш перакананых крытыкаў адміністрацыі прэзідэнта Трампа. «Горад Нью-Ёрк будзе дамагацца кампенсацыі ўсіх грошай, якія Дональд Трамп павінен насельніцтву Нью-Ёрка», — адзначыў дэ Блазіо.

Як сцвярджала The New York Times, Дональд Трамп атрымаў ад імперыі свайго бацькі ў галіне нерухомасці не менш як $413 млн за садзейнічанне ў недаплаце падаткаў.

### У Пентагоне заявілі, што ЗША пачнуць выпрабоўваць гіпергукавую зброю раней чаканага тэрміну

Злучаныя Штаты актыўна працуюць над стварэннем гіпергукавога ўзбраення і пачнуць праводзіць яго выпрабаванні хутчэй, чым таго можна было чакаць. Пра гэта заявіў на сустрэчы з групай журналістаў першы намеснік міністра абароны ЗША Патрык Шанахан.

«Мы пачнём праводзіць запускі хутчэй і часцей, чым гэта маглі чакаць», — цытуе Шанахана тэлеканал CNBC.

Раней міністр абароны ЗША Джэймс Мэціс заявіў, што распрацоўка гіпергукавой зброі і сродкаў абароны ад яе сталі для Узброеных сіл ЗША на цяперашнім этапе галоўным прыярытэтам. Пры гэтым кіраўнік Стратэгічнага камандавання Узброеных сіл ЗША генерал Джон Хайт адзначаў, што Расія і Кітай апярэджваюць Злучаныя Штаты па шэрагу кірункаў распрацоўкі гіпергукавой зброі.

■ Надвор'е

# ЗАМЕРЗЛІ? ЯШЧЭ ПАЦЯПЛЕЕ

## Сіноптыкі абяцаюць: на выхадныя будзе да +22

**Ужо сёння-заўтра надвор'е пачне паляпшацца і выхадныя пацешаць нас цяплом, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Цяплець пачне заўтра. Так, у суботу ў дзённы час на тэрыторыю краіны пачне паступаць цёплая паветраная маса з Заходняй Еўропы. Пры павышаным фоне атмасфернага ціску будзе ў асноўным без ападкаў, толькі ўначы па паўночным усходзе краіны адыходзячы франтальны падзел выкліча кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3—10 градусаў, удзень — 14—20 цяпла.

І ў нядзелю мы застанёмся пад уплывам цёплай вільготнай паветранай масы. Уначы будзе без ападкаў, а ўдзень у асобных раёнах магчымы кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 4 да плюс 10 градусаў. Удзень будзе ўжо 14—20 цяпла, а па поўдні краіны паветра прагрэецца да плюс 22 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у панядзелак пад уплывам атмасфернага фронту ўначы і раніцай у асобных раёнах, а ўдзень па паўднёвым усходзе пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 3 да плюс 10 градусаў. Ужо ўдзень пачне паступаць больш халоднае паветра з Балтыкі і пахаладае. Тэмпература будзе знаходзіцца ў межах ад плюс 8 па поўначы да 17 цяпла па паўднёвым усходзе краіны. Восень...

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ На слыху

# Ва Украіне — чарговая аварыя з беларусамі

**Міністр аховы здароўя Валерый Малашка трымае на асабістым кантролі сітуацыю з суайчыннікамі, якія пацярпелі ў аварыі ў Мікалаеўскай вобласці Украіны, паведаміла прэс-сакратар Міністэрства аховы здароўя Юлія Барадун. Зараз пацярпелым аказваюць дапамогу ўкраінскія медыкі. Пры неабходнасці беларускія спецыялісты дадуць ім любую кансультацыйную дапамогу.**

Па інфармацыі паліцыі Мікалаеўскай вобласці, ДТЗ адбылося каля Крывога Возера з мікрааўтобусам «Мерседэс-Бэнц Спрынтар» з беларускімі нумарамі (Гомельскай вобласці). Здарылася ўсё каля 6 гадзін раніцы на 290-м кіламетры дарогі Адэса — Кіеў. Мікрааўтобус урэзаўся ў грузавы пад'ёмны кран, які ехаў наперадзе ў спадарожным кірунку. Па папярэдніх даных МЗС Беларусі, восем чалавек пацярпелі, двое з іх знаходзяцца ў рэанімацыі. Пазней у прэс-службе міністэрства ўдакладнілі, што ўсяго было шпіталізавана шэсць чалавек.

Гэта ўжо не першае за апошні час буйное ДТЗ у Мікалаеўскай вобласці Украіны, у якім пацярпелі грамадзяне Беларусі. У ліпені адбылося сутыкненне мікрааўтобуса «Фольксваген» з беларускай рэгістрацыяй, які ехаў па маршруце Адэса — Гомель, і грузавіка, што стаяў з правага боку праезнай часткі. У выніку той аварыі кіроўца і чацвёра пасажыраў мікрааўтобуса загінулі на месцы, 12 чалавек трапілі ў бальніцу.

# Лось справакаваў масавае ДТЗ

**Аварыя з удзелам некалькіх аўтамабіляў адбылася ў Кобрынскім раёне з-за лася.**

Па інфармацыі УДАІ УУС Брэсцкага аблвыканкама, дарожна-транспартнае здарэнне было зафіксавана ў 19.25 на аўтадарозе М1/Е30. Паводле папярэдніх звестак, 48-гадовы жыхар Бярозы кіраваў аўтамабілем Mercedes-Benz Sprinter і каля 19.00 рухаўся па названай дарозе з боку Брэста ў напрамку Мінска. На 95-м кіламетры ён урэзаўся ў лася, спыніў рух і выставіў знак аварыйнага прыпынку.

Перад жывёлай, што ляжала на праезнай частцы, спыніўся аўтамабіль Fiat Punto, за рулём якога знаходзіўся 28-гадовы жыхар Жабінкі. У легкавік урэзаўся аўтамабіль Opel Vectra пад кіраваннем 60-гадовага жыхара Івацэвіч. З-за сутыкнення Fiat Punto выехаў на паласу сустрэчнага руху і ўрэзаўся ў аўтамабіль DAF, за рулём якога знаходзіўся 56-гадовы жыхар Малараты. У выніку ДТЗ кіроўца і 25-гадовая пасажырка аўтамабіля Fiat Punto, а таксама кіроўца аўтамабіля DAF з траўмамі шпіталізаваны ў Кобрынскую цэнтральную раённую бальніцу.

Дарэчы, за два дні да гэтага адбыўся падобны інцыдэнт: аўтамабіль сутыкнуўся з ласём, пасажыра давялося дэблакіраваць ратавальнікам. У 3.24 ім ад фельчара хуткай медыцынскай дапамогі паступіла паведамленне аб дарожна-транспартным здарэнні з удзелам легкавога аўтамабіля каля пасёлка Міханавічы Мінскага раёна. Спатрэбілася дапамога ў вымanні пацярпелага. Калі да месца выкліку прыбылі ратавальнікі, было ўстаноўлена, што Volkswagen Passat сутыкнуўся з ласём, які перабягаў дарогу.

Работнікі МНС пры дапамозе адмысловай прылады дэблакіравалі пасажыра аўтамабіля. 37-гадовы мужчына з траўмамі рознай ступені цяжкасці дастаўлены ў бальніцу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ДЗЕЦІ РАГВАЛОДАВЫХ УНУКАЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гісторыкі савецкага перыяду выкарыстоўвалі тэрмін «беларускі народ», не вызначаючы формаў існавання гэтага народа. Усё, што зроблена ў справе вывучэння гістарычных формаў нашай дзяржаўнасці ў IX—XIII, з'яўляецца здабыткам сучасных беларускіх гісторыкаў. Не дарэмна праца Вольгі Ляўко і Дзяніса Дука ў 2016 годзе была намінаваная на Дзяржаўную прэмію ў галіне навукі і тэхнікі. Разбурэнне савецкай сістэмы прывяло да таго, што пачыналі з'яўляцца даследаванні і нават цэлыя тэорыі, якія супярэчаць афіцыйнай трактоўцы савецкага часу. Некаторыя навукоўцы ставяць пад сумненне трыядзінства славянскіх народаў — рускага, украінскага і беларускага, — на якім у СССР будавалася гістарычная палітыка. Напрыклад, ёсць меркаванне, што рускія — гэта не славяне, а славянізаваныя фіна-угры, украінцы — генетычна цюркі, нашчадкі ці то булгар, ці то печанегаў, і толькі беларусы з'яўляюцца адзінымі славянамі сярод так званых усходнеславянскіх народаў.

Як вы разумееце, у кантэксце сучасных падзей гэтыя сцверджанні маюць надзвычай важнае стратэгічнае, геапалітычнае значэнне, могуць аказваць уплыў на знешнюю палітыку краін-суседзяў і нават правакаваць рэгіянальныя канфлікты. Натуральна, нас цікавіць меркаванне прафесіяналаў па гэтым пытанні, аргументы, якія могуць быць прыведзеныя на карысць той ці іншай пазіцыі. Гэты гістарычны перыяд змяшчае нямала фактаў, якія маглі б фарміраваць пазітыўную мадэль гістарычнай памяці, служыць нагодай для нацыянальнага гонару.



Тэму полацкай дзяржаўнасці працягнула **загадчыца цэнтра археалогіі і старажытнай гісторыі Беларусі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар Вольга ЛЯЎКО:**

— На тэрыторыі нашай краіны самымі раннімі з'яўляюцца дзве гістарычныя формы дзяржаўнасці. Першая — гэта раннедзяржаўнае ўтварэнне Полацкая зямля. А другая форма — гэта Кіеўская Русь, у склад якой уваходзіла частка сучасных беларускіх зямель. Кіеўскай Русі належыць два перадзяржаўныя цэнтры — гэта Кіеў і Ноўгарад. А ў Полацкай зямлі адзіны цэнтр — гэта Полацк, вакол якога і развівалася ўся раннедзяржаўная структура.

Ёсць шматгадовыя даследаванні і супастаўленні пісьмовых крыніц па гэтай тэме з тымі матэрыяламі археалагічных даследаванняў, якія нам удалося сабраць і якія агулам збіраліся з 1928 года — з моманту пачатку даследаванняў у Полацку і іншых цэнтрах гэтай зямлі. Нам удалося падвесці пэўную рысу пад праведзенымі вывучэннямі. Ёсць два галоўныя моманты ў тэме. Гэта геаграфічнае размяшчэнне Полацка і магчымасці камунікатыўных сувязяў, якія праявіліся на працягу ўсяго першага тысячагоддзя. З аднаго боку, мы вывучалі зараджэнне і развіццё старажытных гарадоў на тэрыторыі Беларусі. А з іншага, даследавалі праблему эканамічнага развіцця, звязаную найперш з гандлёвымі шляхамі.

У VIII—X стагоддзях, як паказваюць нашы археалагічныя даследаванні, ужо склаліся шляхі, што праходзілі праз тэрыторыю Беларусі, яны звязвалі Поўнач з Поўднем і Захад з Усходам па Дзвіне і па рэках, якія злучалі Дзвінскі басейн з Днепроўскім. Каля гэтых рэк фарміраваліся цэнтры, якія дазвалялі аб'ядноўваць насельніцтва ў пэўныя тэрытарыяльна, эканамічна зацікаўленыя групы з тым, каб развівацца менавіта той участак, дзе быў пэўны цэнтр, які з'яўляўся папярэднікам дзяржаўных утварэнняў.



Пра важнасць дакументальных сведчанняў расказаў **загадчык аддзела гісторыі Беларусі сярэдніх вякоў і пачатку новага часу Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Васіль ВАРОНІН:**

— Я ўдзельнічаў у адным важным выдавецкім праекце, які прадугледжваў публікацыю самых даўніх полацкіх дакументаў, самых старажытных гістарычных крыніц. Дакументы, сабраныя ў зборніку, захоўваюцца ў самых розных краінах. Напрыклад, можна ўбачыць карту Вялікага Княства Літоўскага XVI стагоддзя: межы краіны былі стабільныя і на працягу стагоддзяў мяняліся не шмат, а былі сфарміраваныя ў XII стагоддзі. Цікавым з'яўляецца і пасланне, якое датуецца 1309 годам (цяпер захоўваецца ў Рыжскім архіве). Гэта пасланне полацкага епіскапа Якава да рыжан. У той час у Полацку не было свайго князя, таму, відаць, духоўная асоба выконвала абавязкі і кіраўніка. У гэтай грамаце гаварылася пра розныя пытанні, у тым ліку змяшчалася просьба да рыжан прапусціць у Полацк жыта — відаць, у той час на гэтай зямлі здарыўся неўраджайны год. Яшчэ адзін цікавы дакумент датуецца XV стагоддзем. Гэта дакумент полацкага архіепіскапа Сямёна, які прысвечаны зямельным справам і сведчыць пра землеўладанні полацкай епархіі і манастыроў (захоўваецца ў дзяржаўным архіве Ніжагародскай вобласці ў Расіі). Адметнымі з'яўляюцца і пячаткі горада Полацка і прыватных асоб, пачынаючы з XIV стагоддзя і заканчваючы пачаткам XVI стагоддзя. Усе пячаткі былі прыгожыя, па-рознаму аформленыя і створаныя на розных мовах. Увогуле ж дакументы, што маюць дачыненне да Полацка, цяпер раскіданы ледзь не па ўсёй Усходняй Еўропе. Давялося добра іх пашукаць.



**Рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Куляшова, доктар гістарычных навук, прафесар Дзяніс ДУК** падзяліўся ўласнымі напрацоўкамі:

— Я некалькі дзесяцігоддзяў праводзіў раскопкі ў Полацку, а зараз гэта працягваюць рабіць мае вучні. Мы адкапалі сведчанні і пацвердзілі, што Полацк у IX стагоддзі быў! Здавалася б, гэта даволі просты археалагічны факт, але ён дарагога варты. Пераканаць скептычна настроеную грамадскасць, у тым ліку і нашых суседзяў, можна толькі паказаўшы ім артэфакты, гістарычны слой тых часоў. Сёння пра Смаленск, Ноўгарад такога сказаць нельга, як і пра многія гарады на Русі, а пра Полацк можна — і мы даказалі яго даўняе паходжанне. Больш за тое, мы паказалі, што тая культура, якую мы называем ранneславянскай, культура смаленска-полацкіх доўгіх курганоў датуецца нават раней, чым летапісная згадка Полацка, чым 862 год. Я нават паспрабаваў абгрунтаваць дату: 780-я гады — першая археалагічная згадка гэтых летапісных слаёў у Полацку. Усе ўбачылі — Полацк быў. Аднак які ён быў? Расійскія гісторыкі іранічна сцвярджаюць: «Заурядный городок, затаившийся в речных излучинах» (цытую даслоўна). Пазней, мяркую, прыйшоў скандынаў Рагвалод, які быў чагосьці варты. Аднак трэба звярнуцца зноў жа да археалагічных даных: невядома, з кім прыйшоў Рагвалод, няма археалагічных слядоў прысутнасці скандынаваў у Полацку. Гэта азначае, што істотнай прысутнасці скандынаваў у нас не было. Відавочна і тое, што не было такога, каб сюды прыйшлі славяне і быццам бы знішчылі мясцовае балцкае насельніцтва... Бо слядоў пэўнага катаклізму мы не знаходзім. Усё перацякае даволі плаўна, адна культура — у іншую. Ніякіх слядоў ваенных сутычак мы не знаходзім. Так, сапраўды адбыўся канфлікт з Уладзімірам, які забіў Рагвалода, ажаніўся з Рагнедай і вывез яе ў Кіеў, — у той час тут быў кіеўскі намеснік (мы знайшлі падвеску з трызубцам Уладзіміра, магчыма, яе і насіў намеснік). Аднак як можна растлумачыць тое, што ў гэтым «заурядном городке» без скандынаўскай прысутнасці ў XI стагоддзі адбываецца каласальнае, 20-разовае, павелічэнне плошчы тэрыторыі? Гэта быў акурат той час, калі адрадзілася мясцовая княжацкая дынастыя, якая пазіцыянавала сябе як «Рагвалодавы ўнукі, Ізяславічы». Мясцовая дынастыя ніяк не прэтэндавала на кіеўскі трон. Такім чынам, быў горад, мясцовая дынастыя, свая тэрыторыя. І полацкія князі займаліся тым, што сваім родам гэту тэрыторыю паляпшалі, з дапамогай розных рычагоў, у тым ліку гандлю і рамёстваў. У XI стагоддзі горад зрабіўся надзвычай багатым, тэрыторыя дасягнула 200 гектараў разам з прадмесцямі, у якіх жылі надзвычай таленавітыя рамеснікі (ювеліры). У той жа час стварылася ўнікальная школа дойлідства, маштаб яе будаўніцтва проста ўражвае. А для гэтага патрэбна была эканамічная падтрымка, пэўныя сувязі. Да таго ж яны будавалі, не азіраючыся ні на кога... Візантыйскі канон узялі за матрыцу, а далей стварылі цалкам адметныя формы!.. За палову стагоддзя было пабудавана больш цэркваў, чым пабудавана цяпер...

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

## Экатворчасць

# «Зялёныя» зоркі

### Вызначаны пераможцы конкурсу на найлепшую экапублікацыю

**Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя падвяло вынікі рэспубліканскага конкурсу на самую лепшую публікацыю на экалагічную тэматыку. Сярод пераможцаў ёсць і «звяздоўскія» эколагі.**



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Вераніка КОЛАСАВА атрымала дыплом лаўрэата з рук міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя ХУДЫКА.**

Конкурс сярод журналістаў праходзіць ужо на працягу некалькіх гадоў, асноўная яго мэта — фарміраванне экалагічнай культуры грамадзян і выхаванне ў іх беражлівага стаўлення да прыроды. Сёлета за перамогу ў другім этапе конкурсу змагаліся 37 удзельнікаў у розных катэгорыях і з розных рэгіёнаў краіны, аднак аўтарамі найлепшых публікацый сталі ўсяго 9 з іх. Прыемна адзначыць, што ўжо не першы раз у гэтым спісе ёсць і аўтары часопіса «Родная прырода», які выходзіць у Выдавецкім доме «Звязда».

Так, па выніках рашэння арганізацыйнага камітэта ў катэгорыі «навучэнцы» першае месца было прысуджана Ніне Вялько, другое — Альжбэце Малішэўскай-Спрынчан, трэцяе — Мацвею Белаусаву. У катэгорыі «аматары» першае месца заняў Сяргей Шаршаневіч, другое — Валерый Кавалёнак (абодва — сталыя аўтары «Роднай прыроды»), трэцяе — Святлана Гарэлава. Сярод прафесіяналаў перамаглі Сяргей Мураўскі, Святлана Талкачова, Вераніка Коласава — намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Родная прырода», якую чытачы «Звязды» ведаюць па публікацыях у праекце «Карані і кроны».

Віншуем пераможцаў і жадаем больш новых «зялёных» перамог!

**Кацярына ЦІТОВА.**

## Новыя кнігі

# ЯНКА БРЫЛЬ: ПРАЦЯГ БІЯГРАФІІ

**Выдавецтва «Мастацкая літаратура» пачало рэалізацыю важнага для беларускага асветніцтва праекта: да чытача прыйшоў першы том дзесяцітомнага Збору твораў народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля.**

«Быць чалавекам свайго часу трэба, дакладней кажучы — нельга не быць. Але ж як гэта важна быць яшчэ і над часам, быць тым, хто бачыць далей наперад, вышэй — у агульначалавечае». Уся творчая дарога Янкі Брыля — шлях да самога сябе, жаданне разабрацца ў перыпетыях грамадскага жыцця, спроба асэнсаваць рэчаіснасць. Праз апавяданні і аповесці, праз раман «Птушкі і гнёзды», праз лірычныя запісы і мініяцюры. Янка Брыль усім сваім лёсам выявіў захопленасць мастацкім словам, прыўнёс у нашу чытацкую свядомасць хараство і красу беларускага прыгожага пісьменства. Гэта відаць і па тых цёплых, шчодрых на моўныя фарбы тэкстах, якія склалі першы том запланаванага дзесяцітомніка. Апавяданні і лірычныя замалёўкі, якія ўвабралі творы 1937—1966 гадоў, — як своеасаблівы экзамен, што спадарожнічаў жыццю розных пакаленняў беларускіх чытачоў. У памяці з ранейшых знаёмстваў і адкрыццяў — брылёўскія «Ліпа і клёнік», «Memento mori», «Казачок», «Зялёная школа», «Галя»... Колькі тут шчырасці, сардэчнасці, душэўнасці!.. Такога блізкага да чытача пісьменніка ў беларускай літаратуры трэба яшчэ пашукаць: Янка Брыль умеў быць адкрытым як ніхто, у малых, някідкіх на першы погляд з'явах ён знаходзіў вялікі сэнс, філасофію, вартасці якой прымушалі думаць, разважаць і нават гарэць перажываннямі. Брылёўскае слова рашуча ладзіла разломы розных ландшафтаў рэчаіснасці. Брылёўскае слова і зараз багатае на сучаснасць, сугучнасць звычайнаму, будзённаму і ўзнёсламу, радаснаму сённяшніх нашых дзён.




У рэдкалегію новага Збору твораў вялікага беларускага пісьменніка сучаснасці ўвайшлі вядомыя літаратуразнаўцы, літаратары, дачка Янкі Брыля — Наталля Іванаўна Семашкевіч. У другім томе таксама будуць апавяданні і лірычныя замалёўкі. У трэцім і чацвёртым — аповесці. Пяты том умяшчае раман «Птушкі і гнёзды». У шостым і сёмым — лірычныя мініяцюры. Восьмы — нарысы, літаратурныя партрэты. У дзявятым — літаратурна-крытычныя і публіцыстычныя артыкулы, інтэрв'ю. Завяршае Збор твораў том эпісталярнай спадчыны. Мажліва, з часам мы яшчэ дачакаемся і выдання дзённікаў пісьменніка, над якімі, як вядома, ён працаваў усё жыццё.

**Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ.**




## ЯК КЛІЧУЦЬ, ТАК І АДКЛІКАЮЦЦА

Такога, як сёлета, ураджаю яблыкаў не прыпомняць нават старыя! А ўсё з-за таго, што на квецень садоў не выпала замаразкаў. Вось і ацалела ўсё, вось і спажываем — думаем, як лепш скарыстацца дараваным прадуктам, як захаваць яго ў зіму. Нават самыя руплівыя гаспадыні не ўпраўляюцца варыць варэнні, ставіць кампоты, сушыць... Большасць яблыкаў усё роўна дастаецца скаціне альбо гніе пад дрэвамі. А што рабіць, калі ў сённяшніх вяскоўцаў няма ўжо ні сілы, каб спіны гнуць ды мяшкі цягаць, ні асаблівага жадання — пры цане ў тры капейкі за кіло... Але ж гэта сёлета, а вось некалі...



У ліхія пасляваенныя гады ў многіх гаспадароў старыя пладовыя дрэвы павымярзалі, а маладыя яшчэ не выраслі. Так што большасці дзяцей яблыкі ды грушы хіба сніліся...

Праўда, здараліся і святы: раніцай, бывала, загоніш карову ў агульны статак, а ідзеш назад — цётка Мар'я ўжо назбірала ў фартух чырвоных «цыганак», залацістых антонавак, ужо кажа нам: «Разбірайце, дзетачкі, ешце!..» Ды расцалаваць бы яе за гэтыя словы, за яблычкі!

Але ж дзяцей — нават на нашым хутары — было тады шмат, а цётка Мар'я, вось такая, ці не адна. Іншыя гаспадары ў сваіх садах, можна сказаць, начавалі — пільнавалі яблыкі, нават з сабакамі.

Помню, брат мой Міша — курсант мараходнага вучылішча — прыехаў дамоў на канікулы. Вечарам з сябрам Іванам (абое — вачэй не адвесці — высокія, статныя, Міша да таго ж у прыгожым кіцелі пад шырокай дзягай, у порткахкляшах, бесказырцы...) на вячоркі пайшлі ў суседнюю вёску, што пры самым лесе была. І, відаць жа, добра там «адарваліся», бо дадому ледзь ногі валаклі, яшчэ і таму, што абодва са шматдзетных сем'яў, абодва, можна сказаць, на галодным пайку.

— А давай у гэты сад з табой злазім, — прапанаваў майму брату сябрук. — Белы наліў амаль што паспеў.

Двойчы паўтараць гэту прапанову Івану не прыйшлося. Хлопцы асцярожна рассунулі паркан, з юнацкім спрытам сіганулі праз верхнюю жэрдку, сталі рваць ды па кішэнях распіхваць яблыкі.

Усё гэта рабілася ціха, але ж сабака ўсё роўна пачуў: забурчаўшы ды гаўкнуўшы, пабудзіў гаспадара, і ўжо разам яны рванулі да хуліганаў. Тыя, вядома ж, кінуліся ўцякаць. І нават паспелі, але на дрэве, зачапіўшыся стужкай за сук, засталася вісець бесказырка. Дамоў без яе Міша яшчэ мог вярнуцца, а вось у вучылішча — ды ні ў якім разе! Адлічаць...

Таму хлопцы, адбегшы на бяспечную адлегласць, доўга стаялі, сядзелі ў кустах — чакалі, пакуль гаспадар з сабакам вернуцца на падворак. А ўрэшце, не дачакаўшыся, пайшлі на перамовы.

— Дзед, навяжы сабаку, — папрасіў Іван. — Мы пад яблыняй адну рэч згубілі. Дык будзь чалавекам — дазволь забраць... Яблыкаў чапаць не будзем.

— А чорт вам верыў! — азваўся гаспадар. — Ідзіце адсюль, пакуль сабаку не спусціў!

— Па-добраму, значыць, не хочаш? — грозна спытаў Іван. — Ну тады выбачай: мы не знойдзем тое, што згубілі, а ты ў лесе — сваіх свіней.

Пасля гэтых слоў Іван выдраў з плоту ёмкую парканіну і, не зважаючы на залівісты брэх сабакі, рушыў да свінога хлеўчыка.

— Ты што задумаў? Там жа свіння з парасятамі... Не выпускай, — закрычаў Івану гаспадар.

І ўжо змяняючы гнеў на ласку, дадаў:

— Ідзі ў сад, бяры там, што хочаш. Я сабаку ў будцы запру... Можаш нават яблыкі рваць!

Але хлопцам ужо было не да іх: са знаёмай яблыні Міша зняў сваю бесказырку, і сябрукі, шчаслівыя, рушылі дадому.

**Ніна Бурко,**

*г. Беразіно.*

## ГРЫША І КУ-КЛУКС-КЛАН

Больш за паўвека таму вучыўся я ў СПТВ, жыў у інтэрнаце. За парадкам у ім сачылі вахцёры. Адзін — аднарукі франтавік дзядзька Толя, ставіўся да жыльцоў досыць паблажліва, за бутэльку «жыгулёўскага» мог пусціць у інтэрнат пасля адбою, а за пляшку «чарніла» — нават дазволіць правесці да сябе не вельмі сарамлівую дзяўчыну...

Поўнай супрацьлегласцю яму была зменшчыца, дзеўка гадоў сарака, непрывабная з твару, трохі кульгавая і, мусіць, з-за гэтага злая на ўвесь белы свет, а ўжо на мужчын ды хлопцаў дык што і казаць! Роўна ў дзесяць вечара, калі з радыёкропкі гучаў апошні піск дакладнага часу, яна зачыняла дзверы на засаўку і не адчыняла нікому — як бы хто ні прасіў! Даходзіла да таго, што хлопцы, якія сярод ночы на дызель-цягніку вярталіся ад бацькоў, раніцы чакалі на вакзале. Па чутках, сам начальнік раённай міліцыі пытаў у нашага дырэктара, што за гестапаўка ў нас на вахце сядзіць?

І што было адказаць? Чалавек працуе, выконвае свае абавязкі, трымае дысцыпліну — не падкапаешся. І, як здавалася, нічога не зменіш, але...

У тую восень з надыходам халадоў у наш інтэрнат прыслалі брыгаду маляроў-тынкоўшчыкаў, распачалі так званы касметычны рамонт. Для гэтага і папярэдне нас, жыльцоў з першага паверха, выселілі ў так званы ленінскі пакой, дзе раней можна было паглядзець тэлевізар ды паслухаць палітінфармацыі зампаліта. У асноўным пра тое, як шчасліва жывецца савецкай моладзі і як пакутуюць амерыканскія негры ад расістаў з нейкага Ку-Клукс-Клана... Усе ініцыялы нашай вахцёркі таксама пачыналіся з літары «К». Адкуль і мянушка...

Але ж з'явілася яна — і няхай. А мы ў тым кагале дружна жылі: на галовах хіба не хадзілі, бо цесна было.

Аказалася — побач, у маленькай крамцы, што трымае нейкі прыватнік. На 15 «квадратах» тут знайшоўся ўвесь патрэбны асартымент, уключаючы «малочку». Адшукалася і мая смятанка 15 %-й тлустасці, расфасаваная ў пакеты па 400 грамаў, (праўда, вытворца са сталічнай вобласці)... амаль удвая таннейшая, чым у суседзяў-кааператараў — яе прапанавалі крыху больш чым за рубель. Здзіўленню не было межаў, бо той жа самы прадукт я купляю ў сеткавай краме ў Мінску працэнтаў на 30 даражэй...

«І якая ж выснова?» — спытае чытач. Ды ўсё проста: зразумела, што спажывецкая кааперацыя перажывае не самыя лепшыя часы свайго развіцця, але тэзе разуменне не ідзе ў лад з уласнай кішэняй і самім сабой у якасці спажыўца, які з двух абсалютна аднолькавых па якасці прадуктаў выбірае таннейшы. І не трэба ніякіх аргументаў аб свабодным цэнаўтварэнні і неабходнасці капейкай падтрымліваць галіну — пакупнік ідзе туды, дзе яму выгадней. Вось і атрымліваецца, што галасуе за свой выбар нагамі...

У якасці рэзюмэ дадам, што гэты асобны так званы прыватны выпадак можна сустрэць і ў іншых мясцінах краіны. Нездарма на нарадзе ў Прэзідэнта, што прайшла на мінулым тыдні, прагучала галоўная думка: наспеў час вызначацца, чым будзе займацца спажыўкааперацыя, бо ў лютым неабходна будзе прымаць рашэнне, якой ёй быць далей. Можа варта цяпер займацца той дзейнасцю, дзеля якой галіна і была першапачаткова створана? Праўда, трэба яшчэ адказаць на адно пытанне, якое агучыў старшыня праўлення Белкаапсаюза Валерый Іваноў: а хто паедзе гандляваць у маленькія вёсачкі? Асабліва ахвотных сярод прыватнікаў няма...

А што датычыцца справы сезонных нарыхтовак і дапамогі вяскоўцам па закупе лішкаў ураджаю, то тут кааператары на добрым рахунку. Падрабязнасці падрыхтавалі нашы ўласныя карэспандэнты ў рэгіёнах: з іх матэрыялаў вы даведаецеся, ці можна зарабіць з яблычнага ападу, чаму бульба перастала карыстацца попытам у нарыхтоўшчыкаў і колькі тон кавуноў (!) яны закупілі ў насельніцтва? Што адпраўляюць за мяжу і пакідаюць у краіне? Аб гэтых і іншых цікавых фактах чытайце ў нашай сённяшняй тэме тыдня на старонках 13—15.

# СЕЗОН НАРЫХТОВАК... І ЧАС ПЕРАМЕН

## Знайсці сваё месца

Падчас рабочай сустрэчы Прэзідэнт адзначыў, што ў краіне ўвесь час, з пункту гледжання спажыўкааперацыі, «ваююць за месца пад сонцам» пад наступленнем прыватных гандлёвых арганізацый. Прычым наступаюць яны не толькі ў напрамку горада, але і вёскі.

Напрыклад, «Еўраопт» актыўна заняўся работай на сяле яшчэ некалькі гадоў таму. У 2018-м у планах сеткі адкрыць на вёсцы не менш за 200 стацыянарных крамаў. У кампаніі адзначаюць, што гатовыя адкрыць гандлёвыя пункты ў любой вёсцы з колькасцю насельніцтва ад 400 чалавек.

Удалы эксперымент прыходу буйнога рытэйлера ў цэлы раён ужо можна адзначыць на прыкладзе Аршанскага. Менавіта там, дзе не справілася кааперацыя. Кампанія «Еўрагандаль» змагла рэалізаваць праект па перадачы больш як 30 гандлёвых плошчаў, што раней належалі Белкаапсаюзу пад стварэнне сваіх крамаў. Гэты вопыт палічылі пасяховым і ў перспектыве могуць распаўсюдзіць для падтрымання ўзроўню гандлю ў вёсцы.

Таксама ў сярэдзіне жніўня кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля Качанава паведаміла, што Белкаапсаюз плануе да канца года падаць заяву ў суд аб банкруцтве Аршанскага райспажыўтаварыства і яго ліквідацыі з-за таго, што ў сферы гандлю не выконваецца сацыяльны стандарт па забяспечанасці насельніцтва гандлёвымі плошчамі. А гэта зноў жа сведчыць, што арганізацыя губляе свае пазіцыі.

Аднак кіраўнік Белкаапсаюза працягвае сцвярджаць, што ў сельскай мясцовасці шчыльна заняць нішу гандлю вельмі цяжка. А калі нехта зробіць, то спажыўкааперацыю «гэта зусім не хвалюе, а толькі падгание да лепшай работы».

«Нагнятанне абстаноўкі, невядома дзеля чаго. Дзе хоць адзін пункт грамадскага харчавання ў вёсцы? Дзе на сяле адкрылася добрая прыватная сталовая? Няма такога. А ў нас амаль 1000 такіх сталовых у вёсцы», — заявіў у інтэрв'ю тэлеканалу «Беларусь 1» Валерый Іваноў.

Варта адзначыць, што шмат у чым раней гандлёвае абслугоўванне насельніцтва ў вёсцы залежала ад Белкаапсаюза. Сёння спажывецкая кааперацыя з'яўляецца важным сектарам эканомікі краіны, якая абслугоўвае больш за 3,4 мільёна чалавек і практычна ўсё сельскае насельніцтва. Дробны гандаль з'яўляецца галоўным кірункам работы кааперацыі, доля якога ў агульным аб'ёме яе дзейнасці складае 70 %. Белкаапсаюзу належыць 19 % гандлёвых плошчаў крамаў краіны. У той жа час існуючы патэнцыял спажывецкая кааперацыя выкарыстоўвае недастаткова.

## Гатовыя несці страты?

Па словах Валерыя Іванова, ні адна гандлёвая сетка не дае столькі паслуг насельніцтву, як спажыўкааперацыя. А вось якасць паслуг, іх колькасць, кошт — над гэтым трэба працаваць. «Замяніць спажыўкааперацыю на сёння ў поўным аб'ёме і з поўнай заменай яе функцый нейкай іншай арганізацыяй праблематычна», — адзначыў у інтэрв'ю кіраўнік арганізацыі.

Пры гэтым спажыўкааперацыя працягвае несці страты па шэрагу сваіх кірункаў. Аднак у Белкаапсаюзе не збіраюцца закрываць стратныя гандлёвыя аб'екты на вёсцы.

«Мы вырашылі, што за кошт нейкіх іншых пытанняў, прыбытковых, будзем утрымліваць такія гандлёвыя пункты. Іх 2000. Адначасова закрыць — гэта будзе няправільна.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У гэтым заключаецца адна з сацыяльных функцый спажыўкааперацыі», — адзначыў кіраўнік Белкаапсаюза.

Аднак пры гэтым не ідзе гаворка пра тое, каб змяніць мадэль гандлю, як гэта зрабіў сёння ў сельскай мясцовасці той жа «Еўрагандаль». Арганізацыя нядрэнна працуе і ў вёсцы. Што перашкаджае пераняць гэты вопыт Белкаапсаюзу?

## Цана і асартымент на ўзроўні?

Не на карысць работы кааперацыі сведчыць і той факт, што прыватнікі сёння часта прапануюць пакупніку як лепшы асартымент, так і нізкія цэны. Цэнавы фактар і якасць абслугоўвання для апошніх з'яўляюцца вызначальнымі, каб аддаць сваю перавагу крамам буйных прыватных кампаній, нягледзячы на іх аддаленасць ад дома.

Між тым, як адзначыў Валерый Іваноў у інтэрв'ю тэлеканалу «Беларусь 1», сцвярджэнне, што ў сістэме спажыўкааперацыі цэны вышэйшыя, чым у прыватных структур — з'яўляецца неабгрунтаваным.

«Такога няма. Цэны не вышэйшыя, чым у любой іншай сетцы, а ў пераважнай большасці выпадкаў ніжэйшыя. Мы выкарыстоўваем гандлёвую надбаўку 23 %, а ў цэлым па краіне — каля 30 %», — паведаміў кіраўнік Белкаапсаюза.

У арганізацыі максімальна перанялі фармат работы буйных рытэйлераў. Дызайн і сістэма работы шмат у чым адпавядае прыватным сеткам. Між тым людзі працягваюць указваць менавіта на цэнавы фактар. Мабыць, спажыўкааперацыі неабходна пераняць і мадэль зносін з пастаўшчыкамі, каб вырашыць гэтае пытанне?

## Нарыхтоўка па ўсіх франтах

Гандлёвыя пункты Белкаапсаюза выконваюць функцыю нарыхтоўшчыка. Такую паслугу не можа прапанаваць ні адзін прыватнік. У сістэме дзейнічаюць 750 пунктаў па закупцы ў насельніцтва больш як 30 відаў сельгаспрадукцыі і сыравіны — усяго таго, што яно можа здаць.

Між тым жыхары краіны таксама скардзяцца і на нарыхтоўку. Людзі сёння не асабліва імкнуцца здаваць вырашчаную плодаагароднінную прадукцыю з-за нізкай закупачнай цаны.

Вось і атрымліваецца, што ў жніўні ў СМІ з'явілася інфармацыя аб тым, нібыта Белкаапсаюз мае намер нарыхтаваць сёлета не менш за 100 тысяч тон яблыкаў. У сваю чаргу ў канцы верасня ў інтэрв'ю праграмы «Гутарка ў Прэзідэнта» Валерый Іваноў агучыў вынік нарыхтоўкі яблыкаў толькі больш за 50 тысяч тон.

«Што датычыцца цэн на прадукцыю, то яны не ніжэй мінулых гадоў, а ў некаторых выпадках вышэй. Раннія яблыкі закупляліся па 0,04 рубля за кілаграм, затым цэны павялічыліся да 0,06—0,08 рубля. Невысокі кошт звязаны з нізкім выхадам карыснага прадукту. З 10 кілаграмаў пладоў атрымліваецца адзін літр соку. Рэнтабельнасць не перавышае 2-3 %», — паведаміў кіраўнік спажыўкааперацыі.

Спісваць арганізацыю з рахункаў, вядома ж рана. Занадта шырокае яе поле дзейнасці і занадта шмат людзей уцягнута. Аднак Белкаапсаюз застанецца на плаве толькі ў тым выпадку, калі ён будзе не даганяць буйных прыватных рытэйлераў, а ўкараняць апошнія тэндэнцыі ў гандлі самастойна і раней за канкурэнтаў.

Яшчэ не так даўно спажыўкааперацыя была практычна манапалістам у нішы гандлю. Але калі з'явіліся канкурэнты, якія ўкаранілі новы дызайн крамаў, іншую якасць абслугоўвання і змянілі саму мадэль спажывання, кааперацыя згубіла гэты момант. І толькі калі канкурэнцыя істотна паўплывала на скарачэнне прыбытку, стала зразумела, што Белкаапсаюзу таксама трэба перабудоўвацца. Быць можа час змяніць тактыку і паспрабаваць працаваць на апярэджанне?

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

# Не даць прапасці садавіне

## У справе закупкі яблыкаў у насельніцтва ва ўраджайны год кааператары не маюць канкурэнтаў

**Сезон нарыхтовак у спажыўкааперацыі, можна сказаць, у самым разгары. У гэтым годзе кааператары Брэстчыны закупілі ў насельніцтва шмат чарніц, яблыкаў, агуркоў, памідораў, мёду, кавуноў, зараз ідзе нарыхтоўка грыбоў, бульбы, збожжа.**

Адначасова вядзецца продаж нарыхтаванай прадукцыі. Скажам, 29 верасня, у першы дзень асенніх кірмашоў у Брэсце, у абласны цэнтр прывезлі прадукцыю дзесяць арганізацый спажыўкааперацыі. Прадалі прыкладна палову ад прывезенага тавару. Першыя кірмашы, паводле ацэнкі спецыялістаў, традыцыйна не вылучаюцца актыўнасцю пакупнікоў. На першых прыцэньваюцца, купляюць на наступных.

Удзельнічалі ў асенніх кірмашах і работнікі Пружанскага райспажыўтаварыства. Наперадзе — яшчэ некалькі такіх выездаў. **Старшыня праўлення Пружанскага райспажыўтаварыства Дзмітрый КАРПЕЙ** расказаў, што нарыхтоўкі сёлета вядуцца, несумненна, больш паспяхова, чым летась. Таму што ў гэтай справе шмат залежыць ад ураджаю. Яблыкаў цяпер нарасло як ніколі. Нарыхтавалі іх ужо 882 тоны. Дарэчы, у Пружанах ёсць свая перапрацоўка садавіны. У асноўным нарыхтоўшчыкі, у тым ліку з суседніх раёнаў, вязуць яблыкі на прадпрыемства «Белавежскія віны». З пачатку года там ужо перапрацавана 2044 тоны яблыкаў.

**Старшыня Шчарчоўскага сельскага Савета Пружанскага раёна Віктар ВАНЕКА** расказаў, што сёлета ў іх нарыхтоўкай яблыкаў займаюцца чатыры сельскія крамы: дзве ў Шчарчове, у Галасяціне і Брадах.

— Вяскоўцы падвозяць яблыкі да магазіна, тут іх прадукцыю ўзважваюць і разлічваюцца з гаспадарамі. Варта сказаць, што людзі былі задаволеныя. Здаць нават па пяць капеек за кіло азначае пэўны прыбытак для ўласнага бюджэту, гэта ўсё ж лепш, чым калі б садавіна наогул прапала. Асобныя гаспадары здавалі па некалькі тон адразу. І ніводнай скаргі накошт гэтага ў сельвыканкам не паступіла, — працягвае Віктар Мікалаевіч. — Калі ў сезон грыбоў і ягад у нашым лясным краі бывае нямала прыватных нарыхтоўшчыкаў, у тым ліку з суседніх абласцей, то ў выпадку з яблыкамі такіх ахвотных не знайшлося. Так што спажыўкааперацыя стала адзінай арганізацыяй, якая не дала прапасці садоваму ўраджаю сяльчан.

— У Пружанскім раёне працуе пяць стацыянарных нарыхтоўчых пунктаў, адзін перасоўны, у штаце райспажыўтаварыства — дзесяць нарыхтоўшчыкаў. На час нарыхтоўкі яблыкаў было задзейнічана дадаткова пяць адзінак транспарту, — расказаў **намеснік старшыні праўлення райспажыўтаварыства Аляксандр ЯРОЦКІ.**

Зараз у нарыхтоўшчыкаў працягваецца гарачая пара. Ідзе закуп у насельніцтва і прадпрыемстваў розных формаў уласнасці агародніны, бульбы, журавін.

Такім жа прыкладна чынам працуюць і астатнія спажывецкія таварыствы вобласці ў гэты час. **Намеснік старшыні праўлення Брэсцкага аблспажыўсаюза Аляксей МАКАРЭВІЧ** расказаў, што закуп прадукцыі і сыравіны ў арганізацыях спажывецкай кааперацыі ажыццяўляюць 108 штатных нарыхтоўшчыкаў, у раёнах дзейнічаюць 79 стацыянарных і 22 перасоўныя прыёманарыхтоўчыя пункты, гэтай работай таксама займаецца каля 1,5 тысячы прадпрыемстваў гандлю.

Сёлета, як вядома, у нашых садах вырас небывалы ўраджай яблыкаў. Іх бралі ў насельніцтва для прамысловай перапрацоўкі па пяць капеек за кілаграм, а за таварны яблык давалі ад 30 да 60 капеек. На пачатак кастрычніка арганізацыямі спажывецкай кааперацыі вобласці закуплена 10,4 тысячы тон яблыкаў — гэта амаль удвая больш, чым за аналагічны перыяд летась. Але нарыхтаваць садавіну, закупіць яе ў насельніцтва — толькі палова справы. Важна яе потым рэалізаваць. Для гэтага ў маі — чэрвені былі праведзены перагаворы з перапрацоўчымі прадпрыемствамі, вызначаны адрасы паставак і аб'ёмы. Цяпер кааператары вобласці адпраўляюць яблыкі 17 перапрацоўшчыкам, дзевяць з іх размешчаны за межамі вобласці. Астатнія ідуць у гандлёвыя арганізацыі і закладваюцца ў сховішчы з тым, каб вітамінную прадукцыю прадаваць зімой.

— Агародніна- і бульбасховішчы цяпер надзвычай запатрабаваныя, — гаворыць **начальнік аддзела нарыхтовак аблспажыўсаюза Валерый КАПІТАНЧЫК.** — Іх у вобласці 18. А яшчэ ёсць 88 халадзільных камер для замарозкі і ахаладжэння прадукцыі. Сёлета нашы арганізацыі нарыхтавалі 3900 тон агуркоў, 980 тон таматаў, 1800 тон капусты, першыя дзве тысячы тон бульбы. Работа працягваецца. У кожным раёне запланаваныя аб'ёмы закладкі ў сховішчы.

Асаблівасцю гэтага года, паводле слоў Валерыя Капітанчыка, можна назваць добры ўраджай айчынных кавуноў. Клімат наш палагаднеў, многія ўзяліся за гэтую культуру: і гаспадаркі, і фермеры, — закуплена ўжо 230 тон кавуноў. Чарніц сёлета нарыхтавалі амаль у 15 (!) разоў больш, чым летась. Ідзе нарыхтоўка збожжа, хоць бягучы год быў не надта ўраджайны на збожжа. Дарэчы, на кірмашах яно надзвычай запатрабавана. Часам бывае, прыязджае фермер і забірае ўсё збожжа, якое прывезена на рэалізацыю. Бяруць таксама вяскоўцы і жыхары прыватнага сектара па мяху збажыны для свойскай птушкі. Так што збожжа — прадукт хадавы, і яго нарыхтоўцы ўдзяляецца належная ўвага.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ЯГАДНЫ РАЙ КААПЕРАТАРАЎ

## Як нарыхтоўшчыкі ўтрымліваюць свае пазіцыі

**За дзевяць месяцаў Гродзенскім абласным спажывецкім таварыствам выплачана насельніцтву за сельгаспрадукцыю і сыравіну 21 мільён рублёў, што на 8 % больш, чым за такі ж перыяд летась. Але не ўсе пазіцыі вытрымліваюць выпрабаванне часам. Напрыклад, сёлета знізілася закупка яблыкаў. А вось нарыхтоўка ягад — чарніц і клубніц — значна вырасла. Здатчыкі выяўляюць найбольш выгадныя для іх напрамкі.**



### Танны яблык

Сёлетні год ураджайны на яблыкі. І магчымасць іх здаць таксама ёсць. Да гэтай справы нават падключылі сельскія Саветы, паведамілі ў Гродзенскім аблспажыўтаварыстве. Арганізацыйная работа была праведзена яшчэ на пачатку сезона. Сельскім Саветам была даведзена інфармацыя аб магчымасці закупіць яблыкі і ў вызначаны час іх забраць. З боку сельскіх Саветаў паступілі звесткі аб прыблізнай колькасці здатчыкаў. Гэта дазволіла пазбегнуць стыхійнасці ў нарыхтоўцы.

— Мы, у сваю чаргу, залежым ад патрэб перапрацоўкі, бо ўвесь апад паступае менавіта туды, мы яблыкі не захоўваем, — расказаў **начальнік упраўлення нарыхтовак, прамысловасці і знешнеэканамічнай дзейнасці Гродзенскага абласнога спажывецкага таварыства Андрэй СЦЕФАНОВІЧ.** — Перад пачаткам сезона мы ўзгадняем аб'ёмы і заключаем пад іх дагаворы. Апад ідзе, як правіла, на вінаробчы камбінат.

І хаця яблыкаў многа, ажыятажнага збыту вакол садавіны не назіралася. Насельніцтва не спяшалася збыць свой апад, які літаральна ўсцілаў падворкі. Чаму? Паўплываў цэнавы фактар. Яблык у гэтым годзе стаў вельмі танным: за кілаграм ападу плацілі пяць капеек. Адпаведна, за мяшок атрымоўваецца паўтара рубля. «Перабіваць» цану таксама няма ахвотных. Акрамя спажыўтаварыства, ніхто яблыкі ў насельніцтва не купляе.

Разам з ападам ідзе нарыхтоўка таварных пладоў, закупачны кошт якіх значна вышэйшы — да 50 капеек за кілаграм. Такія яблыкі нарыхтоўшчыкі гатовы купляць не толькі ў сезон, але і зімой, каб потым рэалізаваць насельніцтву праз рознічны гандаль, на рынках і кірмашах.

Нарыхтоўшчыкі канстатуюць: актыўнасць насельніцтва ў здачы яблыкаў невысокая. Прадпрыемствам сёлета прынята каля 8 тысяч тон. У мінулым годзе было 10 тысяч тон.

### Ягадны мікс

Пакуль у грамадстве разважаюць, якія лёс чакае вясковыя яблыневыя сады — можа, наогул іх заменяць нейкія іншыя садовыя культуры, — у гэты час на першы план выходзяць ягады. Асабліва шырокае распаўсюджанне апошнім часам атрымалі клубніцы.

Сёлета нарыхтоўшчыкі спажыўтаварыства закупілі ў насельніцтва на 60 тон ягад больш, чым у мінулы сезон. Уся прадукцыя была рэалізавана праз гандлёвую сетку.

Ягаднымі рэкардсменамі сёлета сталі чарніцы. Так выйшла, што і ўраджай на іх быў нядрэнны, і кошт задавальняў. За кілаграм ягад давалі ад чатырох рублёў і вышэй. Па вобласці спажыўтаварыствам закуплена 212 тон лясной ягады. Летась удалося нарыхтаваць толькі 10 тон. Аб'ёмы, можна сказаць, непараўнальныя.

— Па чарніцах на ўнутраным рынку ёсць канкурэнцыя, — заўважыў Андрэй Сцефановіч. — Але мы трымалі цану, таму і нарыхтвалі такія аб'ёмы. Самыя рэсурсныя раёны — Іўеўскі, Навагрудскі, дзе закупілі па 40 тон ягад. Большасць прададзена за мяжу — у Літву, Расійскую Федэрацыю. Гэта наш экспартны патэнцыял.

Спажыўтаварыства закупляе яшчэ буякі, якія разводзіць сельская гаспадарка Гродзенскага раёна. Ад насельніцтва прымаюць таксама лясныя буякі, брусніцы, чырвоную і чорную рабіну. Зараз вядзецца нарыхтоўка журавін па 3,5 рубля за кілаграм. Ягады ідуць на рэалізацыю праз гандлёвыя аб'екты. Закупленыя ў насельніцтва журавіны рэалізуюцца на рынку, прычым па даволі прымальным кошце ў межах чатырох рублёў.

### Закупілі гарбуз — прыгатавалі фрэш

Апошнім часам назіраецца прыкметны інтарэс да гарбузоў. Дыетолагі разам загаварылі пра карысныя ўласцівасці прадукту, а кулінары прапануюць адмысловыя рэцэпты страў і сокаў. Новымі тэндэнцыямі харчавання скарысталіся і кааператары. Гарбузы і кабачкі нарыхтоўваюць не толькі пад рэалізацыю, але і для сваіх сталовых і кафэ, якіх па вобласці больш за сто.

За адзін кілаграм гарбуза плацяць да 40 капеек. Здатчыкаў хапае, таму ў меню заўсёды ёсць стравы з гарбузоў — аладкі, запяканкі, супы-пюрэ і нават фрэшы. Свежавыціснуты сок гатуецца з гарбуза, яблыка і морквы. Дарэчы, стравы з яблыкамі таксама папулярныя і карыстаюцца попытам у наведвальнікаў кафэ. Асаблівая печыва, адзначылі ў спажыўтаварыстве.

А вось бульба — ужо не такі хадавы тавар, як раней. Відаць, «другі хлеб» здае пазіцыі. Яшчэ летась нарыхтоўшчыкі адгружалі значныя аб'ёмы ў Расію, зараз там сваёй бульбы хапае і канкураваць вельмі цяжка. На ўнутраным рынку таксама няма прапаноў, а ўстановы імкнуцца працаваць непасрэдна з вытворцамі, да таго ж па ўсёй лінейцы сельгаспрадукцыі вядуцца тэндары. Нарыхтоўка ад насельніцтва працягваецца, але аб'ёмы зніжаюцца.

### Акцэнт на «зялёны» тавар

Як вядома, спажыўтаварыствы садзейнічаюць дадатковаму даходу насельніцтва. У сельскіх жыхароў ёсць магчымасць без асаблівых клопатаў на месцы здаць лішкі сваёй прадукцыі. Паступова спрашчаецца і працэдура здачы. Зараз, напрыклад, не патрэбны даведкі з сельскіх Саветаў аб наяўнасці прысядзібных участкаў, а толькі заключэнне аб якасці прадукцыі ад санітарных службаў. Радыелагічны кантроль таварыства праводзіць самастойна.

І ўсё ж галоўным стымулам застаецца цэнавы фактар. Здатчык шукае магчымасць збыць больш выгадны тавар. **Начальнік службы нарыхтовак Навагрудскага філіяла Наталля ДУНАЙ** звярнула ўвагу на рост прапаноў зялёных культур: кропу, пятрушкі, пяра цыбулі. Напрыклад, сёлета філіялам нарыхтавана ажно 800 кілаграм гэтых культур. Асабліва высокі попыт у пяра цыбулі. Некаторыя вяскоўцы пачалі гэтым займацца, каб зарабіць. Яны вырошчваюць зеляніну ў парніках і атрымліваюць ураджай у студзені — лютым, калі кошт за кілаграм дасягае 5-6 рублёў.

Многія вяскоўцы вырошчваюць агародніну лепшых сартоў, якая мае таварны выгляд, што спрыяе і больш высокаму кошту. Дарэчы, грошы за прадукцыю выплачваюцца адразу.

У многіх населеных пунктах ёсць стацыянарныя нарыхтоўчыя канторы, усяго іх па вобласці больш за сто. Кааператары гандлююць на гарадскіх рынках, маюць свае гандлёвыя аб'екты, удзельнічаюць у кірмашах. Апошнім часам назіраецца інтарэс да грыбоў. Лясныя дары закупляюць у насельніцтва, а шампіньёны — у фермераў з суседняй Брэсцкай вобласці. Напрыклад, сёлета закупілі больш за 22 тоны грыбоў. І гродзенцам выгадна, бо ў рэгіёне пакуль няма канкурэнтаў вытворцам шампіньёнаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# КАПЕЙКА РУБЕЛЬ БЕРАЖЭ

## На чым можна зарабіць у сезон нарыхтовак?

**СЁЛЕТА ў Мінскай вобласці надзвычай урадзілі яблыкі. Галіны дрэў літаральна гнуцца пад цяжарам гэтых сакавітых пладоў. Што рабіць з небывалым ураджаем, кожны з гаспадароў рашае сам. Хтосьці цісне сок, варыць варэнне, ставіць кампоты на зіму, забяспечвае гарадскіх сваякоў, корміць хатнюю жывёлу. Нехта здае лішкі ў нарыхтоўчыя арганізацыі Мінскага абласнога спажывецкага саюза. Як кажуць, капейка рубель беражэ.**

Але не ўсіх уладальнікаў асабістых дапаможных гаспадарак задавальняюць цэны. Здатчык хоча рэалізаваць сваю прадукцыю даражэй, а нарыхтоўшчык набыць яе танней. За здадзеную сельгаспрадукцыю насельніцтву і фермерам спажывецкая кааперацыя вобласці ўжо выплаціла каля 42 мільёнаў рублёў. Зразумела, высокая цана на зыходную сыравіну ўплывае на кошт гатовых прадуктаў. Тым больш што спажыўкааперацыя сама купляе і сама ж перапрацоўвае сельгаспрадукцыю. А гэта цягне за сабой дадатковыя выдаткі. Як сцвярджаюць спецыялісты, напрыклад, невялікая цана на яблыкі таксама абумоўлена аб'ектыўнымі прычынамі: для атрымання літра яблычнага соку неабходна перапрацаваць дзесяць кілаграмаў пладоў. Таму і атрымліваецца, што прадукцыя ў крамах часам даражэй за імпартную.

Тым не менш па стане на 1 кастрычніка жыхары цэнтральнага рэгіёна і фермеры здалі ў нарыхтоўчыя пункты 10 424 тоны яблыкаў, тэмп росту да мінулагодняга аналагічнага перыяду 173,5 %. Прыём яблыкаў працягваецца, канчатковы вынік залежыць ад актыўнасці насельніцтва. Апад прымаюць па пяць капеек за кілаграм, а за якасную таварную прадукцыю можна атрымаць рубель і нават больш.

Нарыхтоўчыя арганізацыі спажывецкай кааперацыі Міншчыны адгружаюць яблыкі на кансервавыя заводы для вытворчасці джэмаў, павідла, сокаў, кампотаў, віна ды іншага.

**По стане на 1 кастрычніка жыхары цэнтральнага рэгіёна і фермеры здалі ў нарыхтоўчыя пункты 10 424 тоны яблыкаў, тэмп росту да мінулагодняга аналагічнага перыяду 173,5 %. Прыём яблыкаў працягваецца, канчатковы вынік залежыць ад актыўнасці насельніцтва.**

Мінскі аблспажыўсаюз прымае практычна ўсе віды прадукцыі, што вырошчваецца ў садах і агародах. І з кожным годам аб'ёмы нарыхтовак павялічваюцца. На 1 кастрычніка нарыхтавана 1169,6 тоны капусты (тэмп росту 119,1 % да мінулагодняга перыяду), морквы — 326,8 тоны (тэмп росту 129,2 %), часнаку — 9,8 тоны (тэмп росту 101,9 %). Нашмат больш, чым летась, сёлета назапашана рабіны чарнаплоднай, чорных і чырвоных парэчак, садовых суніц. А чарніц — 542,6 тоны, што ў дванаццаць разоў перавысіла леташнія паказчыкі.

У аблспажыўсаюзе ёсць 43 камеры для заморожвання дзікарослых ягад, адначасовай ёмістасцю каля 800 тон. Яны аснашчаны сучасным абсталяваннем, якое дазваляе падтрымліваць аптымальную тэмпературу і вільготнасць, стварае належныя ўмовы для захавання прадукцыі ў міжсезонны перыяд.

Масавая нарыхтоўка дароў прыроды наладжана праз гандлёвыя аб'екты, прыёмныя нарыхтоўчыя пункты, у тым ліку перасоўныя. Здаць вырашчанае на прысядзібных участках, сабранае ў лесе можна больш як у 800 крамах, 71 нарыхтоўчым пункце, у тым ліку 59 стацыянарных. Зборам займаюцца больш як 120 нарыхтоўшчыкаў. Калі хтосьці не зможа прывезці прадукцыю па адрасе самастойна, то да яго прыедзе нарыхтоўшчык. Ёсць таксама брыгада па аказанні насельніцтву дапамогі па зборы, упакоўцы ў сеткі, мяшкі, скрыні і пагрузцы ў аўтатранспарт яблыкаў. Асабліва даспадобы такая паслуга пажылым людзям ды інвалідам.

Жыхары цэнтральнага рэгіёна рэгулярна інфармуюцца аб відах прадукцыі, якая прымаецца, месцах, дзе яе можна здаць, закупачных цэнах.

Для стварэння стабілізацыйных фондаў у сістэме аблспажыўсаюза ёсць 32 сховішчы для агародніны, садавіны, якія аднačасова могуць змясціць 8053 тоны прадукцыі. Паводле рашэння Мінаблвыканкама на міжсезонны перыяд 2018—2019 гадоў будзе закладзена 1300 тон бульбы, 1000 тон капусты, 345 тон морквы, 400 тон буракоў, 540 тон цыбулі, 230 тон яблыкаў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Бізнес на дарах прыроды

**УРАДЖАЙ на яблыкі сёлета асабліва багаты, і шмат хто хацеў на іх зарабіць. Але цана ад спажыўкааперацыі — 5 капеек за кілаграм — расчаравала. Гэта ж цэлую тону трэба назбіраць, каб атрымаць 10 рублёў. У выніку частка ўраджаю так і засталася гніць на прысядзібных участках. Крыўдна.**

— Згодны, 5 капеек за кілаграм — гэта не цана, але ж тут не ўсё ад нас залежыць, — кажа **начальнік аддзела нарыхтовак, ЗЭД і рынкаў Магілёўскага аблспажыўсаюза Аляксей СІРОЦІН.** — Быў перыяд, калі перапрацоўшчыкі прымалі яблыкі па 9 капеек за кілаграм, а мы трымалі вельмі высокую планку — 7 капеек. Гэта з улікам таго, што са свайго даходу (з тоны атрымлівалі ўсяго 20 рублёў) плацілі заработную плату нарыхтоўшчыкам і неслі адчувальныя транспартныя выдаткі. Бо прыйшлося добра пакаляесіць па вёсках. Да таго ж мінімальная цана распаўсюджваецца толькі на яблычны апад. Таварны яблык мы прымаем па цане 30 капеек за кілаграм. Але ў гэтым выпадку павінны быць яблычак да яблычка. Насельніцтва ж часцей за ўсё прапануе першы варыянт. Такія яблыкі хутка гніюць, і іх каштоўнасць падае на вачах. Перад тым, як усталяваць канкрэтную суму, мы заўсёды аналізуем кан'юнктуру рынка. Калі летась яблыкаў не было і перапрацоўшчыкі гатовы былі браць іх па 20 капеек за кілаграм, мы і арыентаваліся на гэтыя расцэнкі.

Па сутнасці, кожны з нас сам сабе гаспадар. Тыя, хто не паленаваўся зняць ураджай і самастойна прадаць яго на рынку, не прайгралі. Найбольш апетытныя, буйныя і наліўныя плады ішлі па рублі і болей за кілаграм.

Цана — паняцце адноснае.

Але калі ацэньваць, колькі насельніцтва атрымала ад спажыўкааперацыі грошай за сваю садавіну-агародніну і другасную сыравіну, лічба атрымаецца больш важкая. У Магілёўскай вобласці за 9 месяцаў здатчыкам выплачана больш за 20 мільёнаў (!) рублёў.

— Мы пастаянна нешта купляем у вяскоўцаў. Тых жа яблыкаў на 3 кастрычніка нарыхтавалі больш за 16 тысяч тон — 157 % да ўзроўню мінулага года на такі ж перыяд. І гэта пры тым, што ставілі перад сабой задачу закупіць дзесьці каля 15 тысяч тон. Але нарыхтоўкі працягваюцца да сённяя, — адзначае Аляксей Сіроцін.

Больш актыўна яблыкі закупляюць у Магілёўскім, Горацкім, Дрыбінскім, Кіраўскім раёнах. Горкі і Кіраўск наогул нарыхтавалі па 2 тысячы тон.

Нядрэнныя лічбы і па астатніх пазіцыях. Практычна па ўсіх леташнія аб'ёмы перавыканана. Агуркоў закуплена 1130 тон — 109 % у параўнанні з гэтым жа перыядам мінулага года, памідораў — 1023 тоны (114 %), капусты наогул 1778 тон (154 %), суніц садовых — 107 тон, чорных парэчак больш за 500 тон. Па вобласці прыём садавіны-агародніны вялі больш за 1000 крамаў, працавалі больш за 100 нарыхтоўшчыкаў.

Уся садова-лясная смаката часткова рэалізоўвалася праз гандлёвую сетку спажыўкааперацыі, а таксама ішла перапрацоўшчыкам і нават на экспарт. Напрыклад, з больш чым 350 тон закупленых чарніц больш як 80 % адправілася за мяжу. А гэта валюта для краіны.

Нарыхтоўкі між тым працягваюцца. Зараз акцэнт робіцца на журавіны. І цана прывабная — ад 3 рублёў за кілаграм.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

ФОТАФАКТ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЖУРАВІНАВАЯ ЭСТАФЕТА

**Вёска Стралкі Верхнядзвінскага раёна знаходзіцца паблізу журавінавых балот, і таму кожную восень жыхары ўключаюцца ў ягадную эстафету — збіраюць і здаюць свае вітамінныя «трафеі» нарыхтоўшчыкам. Вось і ў двары Наталлі НЯКРАСАВАЙ *(яна на фота)* сёлета адкрыты пункт здачы ягад і грыбоў. На здымку вясковы пенсіянер Іван КІСЛОЎСКІ пасля чарговага ягаднага пахода на балота здае свой журавінавы ўраджай.**

# НЕ ДА АКЦЫЙ І ЗНІЖАК...

**У апошнія гады спажывецкая кааперацыя губляе свае пазіцыі на спажывецкім рынку, адзначаюць у камітэце дзяржкантролю Гомельскай вобласці. Толькі летась колькасць аб'ектаў гандлю спажыўкааперацыі на Гомельшчыне скарацілася на 107 аб'ектаў, зменшыўся розанічны тавараабарот.**

Спецыялісты дзяржкантролю сёлета правялі маніторынгі гандлёвай інфраструктуры чатырох суб'ектаў гаспадарання: Добрушскага і Кармянскага райспажыўтаварыства, а таксама прадпрыемстваў «Добрушгандаль» і «Кармахарчгандаль». Ва ўсіх аб'ектах гандлю Добрушскага і Кармянскага раёнаў былі выяўлены сур'ёзныя недахопы: не выконваліся санітарныя нормы і правілы, адсутнічала частка дакументаў, выкладвалася неўпакаваная прадукцыя на дно ахаладжальных вітрын, парушаліся правілы гандлю... Акрамя таго, у пяці крамах пакупнікам прапанавалася адзінаццаць найменняў пратэрмінаванай прадукцыі.

Дарэчы, спецыялістамі Жлобінскага міжраённага камітэта дзяржаўнага кантролю летам быў праведзены маніторынг аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання адпаведнага раёна. Падчас праверкі сеткі крам мясцовага райспажыўтаварыства выяўлены факты продажу тавараў з пратэрмінаванай прыдатнасці, агародніны і пладоў з прыкметамі недабраякаснасці, парушэннем цэласнасці лупіны, шматлікія факты ўжывання сродкаў вымярэння са скончаным тэрмінам паверкі. У асобных гандлёвых аб'ектах спаганялася дадатковая плата за пакаванне вагавых тавараў.

Пастаянная крэдыторская запазычанасць перад пастаўшчыкамі і недахоп уласных абаротных сродкаў не дазваляюць арганізацыям гандлю спажыўкааперацыі падтрымліваць у гандлёвай сетцы шырокі асартымент тавараў, развіваць і прасоўваць папулярныя праграмы лаяльнасці для пакупнікоў ( розныя акцыі, зніжкі, бонусы, гандлёвыя назапашванні...). Гэта ў разы змяншае канкурэнтаздольнасць такіх гандлёвых аб'ектаў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ПЛЮС 100!

**У Талачыне сёлета прайшла сотая рэгістрацыя нованароджанага.**



Аддзел ЗАГС павіншаваў маладых бацькоў з райцэнтра Дзмітрыя і Кацярыну Пазняковых, чыя дачка Мілана стала сотым зарэгістраваным малым у 2018 годзе, паведамляе «Наша Талачыншчына».

Падчас урачыстай рэгістрацыі нованароджанай прысутнічалі бацькі, бабулі малой, мясцовы актыў.

— Паважаныя бацькі, няхай нараджэнне дзіцяці яшчэ больш аб'яднае вашу сям'ю. Матулі прынясе шчасце і ўсведамленне вялікай моцы жанчыны, а бацьку — вялікі гонар за тое, што гэты маленькі чалавек носіць яго прозвішча, з'яўляецца яго працягам. Не забывайцеся, што сапраўднае шчасце сям'і, калі ў хаце гучаць дзіцячыя галасы. І па традыцыі аддзел ЗАГС з вамі не развітваецца, а кажа вам: «Да новых сустрэч». Чакаем вас праз некаторы час з яшчэ адным сынам або дачушкай, — пажадала бацькам загадчыца загса Ірына Парэпка.

Дарэчы, для Дзмітрыя і Кацярыны нованароджаная стала другім дзіцём у сям'і, пара ўжо выхоўвае пяцігадовага Данііла.

## ВЫХАВАННЕ Ў НАЙЛЕПШЫХ ТРАДЫЦЫЯХ

**Юныя браслаўчане вывучаюць з маленства беларускую мову і народныя традыцыі.**

Такім яскравым і ў той жа час надзвычай цёплым і пяшчотным атрымалася чарговае свята ў першым гарадскім дзіцячым садку. А прысвячалася яно Году малой радзімы і роднай беларускай мове, паведамляе «Браслаўская звязда».



Дарэчы, выхавальнікі гэтай дзіцячай установы пра важнасць ведання мовы не забываюць: вывучаюць з малымі беларускія вершы і песні, праводзяць заняткі па-беларуску. Ды і прылашчыць ці пажурыць на роднай мове атрымліваецца так натуральна! Вось і на свяце дзеці з задавальненнем расказвалі вершыкі, спявалі, гулялі ў народныя гульні. Акрамя таго, даведаліся ад выхавальнікаў цікавыя факты пра сваю малую радзіму.

## СТРОЙ НАРОДНЫ — ЗАЎСЁДЫ МОДНЫ

**Арт-праект «Творчасць. Пазнанне. Уменне» прайшоў у аграгарадку Валаўск Ельскага раёна, піша «Народны голас».**



Дзень адкрытых дзвярэй у Валаўскім цэнтры народных традыцый ператварыўся ў сапраўдную сельскую вечарыну.

У той дзень у вясковы клуб завіталі выхаванцы мясцовай сярэдняй школы. Работнікі цэнтра прэзентавалі відэапраект аб роднай старонцы, які быў прысвечаны Году малой радзімы. А надалей школьнікаў чакала сапраўдная сельская вечарына. Паколькі мерапрыемства праходзіла сярод розных старадаўніх рэчаў, то дзеці з цікавасцю даведаліся, як гэтыя прылады працы карысталіся нашы продкі, якое адзенне насілі ў святы і паўсядзённа. Пад апладысменты гледачоў прайшло дэфіле народнага адзення «Строй народны — заўсёды модны».

А потым пачалося самае сапраўднае вясковае свята. Народны жаночы ансамбль «Валошкі» спяваў прыгожыя песні разам са школьнікамі. Дзеці адгадвалі загадкі, спявалі знаёмыя ўсім народныя песні, гулялі ў гульні, а потым яшчэ і танцавалі. Раўнадушных на свяце не было.

**Падрыхтавала Вольга АНУФРЫЕВА.**

# ЗЯЛЁНЫ КВЭСТ ПА НАВАГРУДКУ

**Ён стаў пілотным горадам праекта ГЭФ-ПРААН-Мінпрыроды «Падтрымка зялёнага горадабудаўніцтва ў малых і сярэдніх гарадах Беларусі» («Зялёныя гарады»), не мог застацца ўбаку ад правядзення кампаніі Еўрапейскі тыдзень мабільнасці. Жыхары горада актыўныя і жыццярадасныя, а гарадская адміністрацыя імкнецца забяспечыць устойлівую мабільнасць з дапамогай не толькі правядзення масавых мерапрыемстваў, але і рэканструкцыяй з акцэнтам на экалогію.**

Журналісты і госці Навагрудка прайшлі пешшу па вуліцах, каб выканаць гарадскі квэст, распрацаваны мясцовым райвыканкамам, і пазнаёміцца з горадам.

На цэнтральнай плошчы райцэнтра адбыўся сімвалічны заезд на веласіпедах і самакатах з удзелам школьнікаў, моладзі і выхаванцаў дзіцячых садкоў, а дзень завяршыўся велапрабегам «Да мэты ўстойлівага развіцця № 11 — на веласіпедзе!». Велапрабег прайшоў да ветрагенератараў, усталяваных пад Навагрудкам.

**Іаана КАЗАНА-ВІШНЯВЕЦКАЯ, каардынатар ААН, пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі,** якая не толькі ўзнагароджвала юных удзельнікаў, але і прымала ўдзел у 12-кіламетровым велапрабегу, прызналася:

— Я толькі пачынаю знаёміцца з беларускімі гарадамі і вельмі рада, што ў Навагрудку столькі неабыякавых людзей. Яны выбіраюць актыўнасць, здаровы лад жыцця і могуць гэта рабіць ва ўмовах такога прыгожага горада. Рух на роварах — гэта вельмі добра для здароўя людзей, для прыроды, для камунікатыўных зносін. Мы рады былі далучыцца да гэтага мерапрыемства і працаваць разам.

Навагрудак валодае вялікім турыстычным патэнцыялам, перакананыя ў гарадской адміністрацыі, але гэты патэнцыял неабходна развіваць. За год у горадзе бывае каля 50 тысяч турыстаў (для параўнання: насельніцтва самога райцэнтра складае каля 30 тысяч чалавек), але гэтая лічба можа быць павялічана ў некалькі разоў пры развіцці сферы паслуг. Навагрудак мае старажытную гісторыю, тут ёсць археалагічныя і архітэктурныя ўнікальныя аб'екты, пры гэтым актыўна развіваецца зялёнае будаўніцтва, і горад удзельнічае ў экалагічных праграмах. Такі сінтэз багатай гісторыі і сучаснай экалагічнай накіраванасці прыцягвае турыстаў.

### Гэта цікава

У цэнтры горада — плошча, да якой вядуць восем (!) вуліц. Тут маецца свой гісторыка-краязнаўчы музей, адна з экспазіцый якога расказвае пра перыяд ВКЛ. Музей быў пабудаваны ў 1936 годзе ў стылі эклектыкі.

У горадзе ёсць уласная карцінная галерэя мастака Кастуся Качана.

У Навагрудку ўстаноўлена каля 60 пляцовак, 200 кантэйнераў для раздзельнага збору цвёрдых камунальных адходаў. Іх атрымалася ўстанавіць з дапамогай праекта ЕС. Ёсць сартавальная станцыя, а таксама зацверджаны праект аб будаўніцтве завода па перапрацоўцы адходаў.

У Доме-музеі Адама Міцкевіча (адкрыты ў 1938 годзе, рэканструяваны ў 1990-м) у рамках праекта ЕС-ПРААН «Развіццё на мясцовым узроўні» з'явіліся аўдыягіды і спецыяльнае абсталяванне для чытання людзьмі з аслабленым зрокам. У доме-музеі ёсць падземны пераход, які злучае жылы дом з флігелем. Экскурсавод па просьбе гасцей можа правесці экскурсію на рускай, беларускай і польскай мовах.

У Навагрудку, на месцы, дзе сёння стаіць помнік Адаму Міцкевічу (яго аўтар — Валяр'ян Янушкевіч), у X—XIII стагоддзях было паселішча рамеснікаў.

Французскія эксперты, якія нядаўна наведвалі горад і распавядалі аб інавацыйных метадах горадабудаўніцтва, казалі пра тое, як трэба «астуджаць» гарады. Яны распрацавалі спецыяльны софт для вызначэння камфортнасці пражывання ў гарадскіх умовах (тэмпература, улік скарачэння выкідаў $CO_2$ і г. д.). У горадзе ёсць курган Адама Міцкевча, які з'яўляецца наглядным прыкладам таго, як можна панізіць тэмпературу: паўднёвы схіл на некалькі градусаў цяплейшы за паўночны.

У горадзе плануюць распрацаваць план энергаэфектыўнага квартала. На цяперашнім этапе беларускія спецыялісты вывучаюць замежны вопыт (як praктаваць такую забудову, якія існуюць інструменты і праграмнае забеспячэнне). Актыўная работа над такім кварталам пачнецца ў пачатку 2019 года. Пакуль не вызначана, будзе гэта новабудоўля альбо рэканструкцыя старога квартала (апошняе, на думку распрацоўшчыкаў, найбольш актуальна).

У стварэнні парку ў 1925—1926 гадах прымаў актыўны ўдзел Барыс Кіт, дырэктар Навагрудскай беларускай гімназіі, які пасля вайны эміграваў у ЗША, стаў вядомы ў сферы астранаўтыкі, працаваў у НАСА і прымаў удзел у распрацоўцы вадароднага паліва, сродкаў сувязі пры палётах.

Найстаражытная ў горадзе царква, якая захавалася (падмурак XIII стагоддзя, мур XVI стагоддзя) — Барысаглебская.

Разбураная царква Успення Маці Божай была знойдзена пад зямлёй археолагамі. У царкве праходзілі пасяджэнні Трыбунала ВКЛ, гэта быў вышэйшы Апеляцыйны суд княства.

У Навагрудку вельмі ўзгорыстая мясцовасць. Старыя брукаваныя дарогі былі замененыя на асфальтавыя. Пасля дажджоў людзі сутыкнуліся з праблемай затаплення, паколькі вада хутка і беспераашкодна сцякае з горак. Там жа, дзе захаваўся брук, такіх праблем няма.

У горадзе рэалізаваўся праект «Прасвятленне» — мясцовая праграма, накіраваная на далучэнне людзей з інваліднасцю ў грамадскае жыццё. Гэта з'яўляецца пунктам зялёнага горадабудаўніцтва, і ён даступны кожнаму гораду.

**Вольга ПРАЛЮК.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**

**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 292 44 12;

**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 4 кастрычніка 2018 года.**